

ЧЫМ ЖЫВЕ ПРЫГАЖУНЯ Ў ФОРМЕ

ЧЫРВОНКА

КУПАЛЫ НАД БЯРЭЗІНАЙ 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 ЖНІЎНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 163 (30297)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вераніка ГУДКОВА, сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ:**

*«Маладзёжныя экіпажы намалацілі больш як 865 тысяч тон збожжа і зернебабовых. У той жа час маладыя вадзіцелі перавезлі больш як 413 тысяч тон. Гомельская вобласць па-ранейшаму займае першае месца па колькасці намалочаных тон — 393 тысячы, у той жа час лідарам па перавезеным маладымі кіроўцамі збожжы і зернебабовых стала Мінская вобласць — больш за 145 тысяч тон. Колькасць тысячнікаў сярод маладзёжных экіпажаў дасягнула 200, а сярод маладых вадзіцеляў такіх ужо 163».*

# Птушкі — справа сур'ёзная



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Аператар птушкафабрык і механізаваных ферм ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» Тамара УЛАСЕНКА амаль трыццаць гадоў працуе ў роднай гаспадарцы. Удзельніца II Рэспубліканскага форуму працаўніц вёскі, яна адзначана Ганаровай граматай Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта і ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Гомельскага райвыканкама. Неаднаразова за дасягненне высокіх паказчыкаў у сельскагаспадарчай вытворчасці была занесена на Дошку гонару Гомельскага раёна. За працоўныя поспехі ў 2023 годзе працаўніца ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» узнагароджана нагрудным знакам Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання «За заслугі ў сельскай гаспадарцы».**

## КОРАТКА

• Дэфіцыт бюджэту Беларусі ў 2025 годзе чакаецца на ўзроўні Br4,5 млрд.

• **За студзень — ліпень 2024 года сукупны аб'ём біржавых здзелак, праведзеных прадпрыемствамі Кіраўніцтва справаў Прэзідэнта, склаў Br128,4 млн, што на 71 працэнт больш за аналагічны перыяд мінулага года.**

• У Беларусі матэрыяльную дапамогу на падрыхтоўку дзяцей да школы атрымалі ўжо больш як 101 тыс. шматдзетных сем'яў на 201 тыс. дзяцей.

• **Больш за 1,3 млн тон сталі выраблена на БМЗ па выніках сямі месяцаў гэтага года.**

• За апошнія пяць гадоў у Беларусі нарасцілі аб'ёмы вытворчасці рапсавага алею ў 1,4 раза — з каля 417 тыс. т у 2019 годзе да 578 тыс. т у 2023 годзе.

Напярэдадні

# Найлепшы сябар школьніка

Да першага верасня ў школах з'явяцца тры новыя навучальныя дапаможнікі



Фота Лізаветы ГОПАД.

**Ранцы вучняў пацяжэюць — другакласнікі дададуць у іх дапаможнік па асновах бяспекі жыццядзейнасці. Асновы дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі будуць вывучаць навучэнцы дзявятых класаў, кадэцкіх вучылішчаў, спецыялізаваных ліцэяў і Суворcaptain... **

Сезонны клопат

# РЫХТУЙ ДАРОГІ ЛЕТАМ...

## У дарожнікаў — зімовыя турботы

**Падрыхтоўка рэспубліканскіх аўтамабільных дарог і вулічна-дарожнай сеткі Мінска да зімы вядзецца на працягу ўсяго лета, а цяпер гэтыя работы ўвайшлі ў найбольш актыўную фазу. Устараняецца калейнасць, праводзіцца ямачны рамонт, вядзецца ахоўная апрацоўка дарожнага пакрыцця, а таксама рамантуюцца машыны і абсталяванне, нарыхтоўваецца пясчана-саляная сумесь і тэхнічная соль.**

СТАР. 6



ISSN 1990 — 763X

24163>

Наша пазіцыя

# «Акты ядзернага тэрарызму могуць ствараць пагрозу міжнароднаму міру і бяспецы»

**Прэзідыум Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выступіў з заявай у сувязі з пагрозамі ядзернай бяспецы на асобных атамных электрастанцыях, чым выказаў глыбокую занепакоенасць у сувязі з паведамленнямі аб магчымых атаках і правакацыях ВСУ ў адносінах да шэрагу ядзерных аб'ектаў. У прыватнасці, размова ідзе аб Курскай і Запарожскай атамных электрастанцыях.**

Савет Рэспублікі асуджае вар'яцкія акты нанясення ўдараў па энергетычнай інфраструктуры горада Энергадар і Запарожскай атамнай электрастанцыі, у выніку якіх, паводле ацэнак спецыялістаў, пагаршаецца сітуацыя з ядзернай бяспекай на Запарожскай АЭС.

«Беларусь як краіна, якая найбольш пацярпела ад наступстваў аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, як ні адна іншая краіна ўсведамляе ступень найцяжэйшых доўгачасовых наступстваў тэхнагенных катастроф на ядзерных аб'ектах, — сказана ў заяве. — Па маштабах радыеактыўнага выкіду і яго наступстваў катастрофа на ЧАЭС нашмат перасягнула найбольш сур'ёзныя тэхнагенныя аварыі, якія адбыліся да і пасля яе. У той ці іншай ступені наступствы чарнобыльскай катастрофы закранулі больш за два дзясяткі краін. З цягам часу і да міжнароднай супольнасці прыйшло больш глыбокае разуменне маштабаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, якое ўвасобілася ў абвяшчэнне Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый 26 красавіка Міжнародным днём памяці аб чарнобыльскай катастрофе».

Як заўважана ў заяве, нягледзячы на неаднаразовыя заклікі кіраўніцтва Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) да стрыманасці, сітуацыя вакол Запарожскай АЭС застаецца складанай. «Сёння, калі адбываецца чарговая эскалацыя канфлікту ва Украіне, мы вымушаны нагадаць аб Міжнароднай канвенцыі аб барацьбе з актамі ядзернага тэрарызму, у якой сярод іншага адзначаецца, што акты ядзернага тэрарызму могуць прыводзіць да самых сур'ёзных наступстваў і ствараць пагрозу міжнароднаму міру і бяспецы, — гаворыцца ў заяве Прэзідыума Савета Рэспублікі. — Заклікаем парламенты і парламенцкія арганізацыі кансалідаваць намаганні па папярэджанні і барацьбе з актамі ядзернага тэрарызму, у тым ліку садзейнічаць умацаванню міжнароднага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі ў распрацоўцы і прыняцці эфектыўных практычных мер для папярэджання такіх актаў і для крымінальнага пераследу і пакарання вінаватых».

Кіраўніцтва ААН і МАГАТЭ заклікае неадкладна і самым рашучым чынам рэагаваць на сітуацыі, якія ствараюць пагрозу ядзернай бяспецы на атамных электрастанцыях у выніку атак на іх і інфраструктуру, якая іх забяспечвае. «Заахвочваем трымаць гэтае пытанне ў фокусе пільнай публічнай увагі і рэгулярна інфармаваць аб становішчы спраў і прэвентыўных мерах, якія прымаюцца», — падкрэслена ў заяве.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

Эканоміка

# РОСТ ВУП І ПАВЕЛІЧЭННЕ ЗАРОБКАЎ БЮДЖЭТНІКАЎ

## Савет Міністраў разгледзеў пакет прагнозных дакументаў на 2025 год

**Адкрываючы пасяджэнне ўрада, Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА адзначыў, што падрыхтоўка да ўнясення кіраўніку дзяржавы праектаў найважнейшых параметраў прагнозу бюджэту і мэтавых паказчыкаў грашова-крэдытнай палітыкі на 2025 год блізіцца да фіналу. Праекты дакументаў былі разгледжаны і ў цэлым адобраны на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна, дадзены асобныя даручэнні па дапрацоўцы шэрагу пытанняў. У выніку ўнесены ўдакладненыя праекты дакументаў. Ключавыя параметры ўрада і Нацыянальнага банка на наступны год засталіся без змяненняў.**

### САЦЫЯЛЬНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ БЮДЖЭТУ ЗАХОЎВАЕЦЦА

«Рост эканомікі запланаваны на ўзроўні 4,1 %, што вышэй за тэмпы развіцця сусветнай эканомікі, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — У аснове росту — актыўнае інвестыцыйнае развіццё. Прырост інвестыцый у асноўны капітал павінен скласці 7,8 % пры агульным аб'ёме амаль Br50 млрд. Плануецца рэалізацыя больш як 600 інвестыцыйных праектаў, уключаючы 134 рэгіянальныя, 70 імпартазамяшчальных і 27 інтэграцыйных».

У планах — пабудаваць 4,5 млн кв. м жылля, у тым ліку з павелічэннем арэнднага ў колькасці 600 тыс. кв. м. Запланавана будаўніцтва і рэканструкцыя 15 дзіцячых садкоў, 26 школ (з іх не менш як 10 новых), каля 20 спартыўных аб'ектаў і 23 аб'екты аховы здароўя, узвядзенне і рамонт больш як 1,5 тыс. км дарог рэспубліканскага і мясцовага значэння.

Экспарт плануецца павялічыць на 5,4 %. «Па разліках Міністэрства эканомікі, прагнозы развіцця знешніх рынкаў даюць магчымасць нарасціць валютную выручку на $2,8 млрд, — паведаміў Раман Галоўчанка. — Аб'ёмы экспарту павінны дасягнуць $52 млрд. Гэта максімальнае значэнне на гарызонце даследаванняў. Пры гэтым сальда знешняга гандлю прагназуецца дадатным на ўзроўні 0,5 % да ВУП».

Па яго словах, інфляцыю неабходна ўтрымаць у параметрах пяцігадовай праграмы — не больш як 5 %. «Рэалізацыя запланаваных паказчыкаў мэтавага сцэнарыя дасць магчымасць забяспечыць рост рэальных грашовых даходаў насельніцтва на ўзроўні 4 % пры росце рэальнай зарплаты на 4,7 %», — падсумаваў кіраўнік беларускага ўрада.

Расходы на аплату працы ў бюджэтнай сферы Беларусі павялічацца ў 2025 годзе на 14,7 %. «Бюджэт на 2025 год сфарміраваны, зыходзячы з мэтавага сцэнарыя прагнозных параметраў, — удакладніў прэм'ер-міністр. — У працэсе дапрацоўкі і ўзгаднення з зацікаўленымі праектаў бюджэту і змяненняў у Падатковы кодэкс істотных змяненняў па базавых лічбах не адбылося. Як і ў ранейшыя гады, будзе захавана сацыяльная накіраванасць бюджэту».

Так, расходы на фінансаванне сацыяльнай сферы павялічацца амаль на 14 % у параўнанні з ацэнкай бягучага года, у тым ліку на Br1,7 млрд павялічацца расходы на адукацыю і на Br1,5 млрд — на ахову здароўя. «На 14,7 працэнта будуць павялічаны расходы на аплату працы ў бюджэтнай сферы і складуць Br20,2 млрд, — канстатаваў Раман Галоўчанка. — Таксама павялічацца сумы, што накіроўваюцца на выплату сацыяльных дапамог. Пенсіі вырастуць сувымерна аплаце працы ў бюджэтнай сферы».

Дзяржава працягне субсідзіраваць будаўніцтва жылля для тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама неабходнай інфраструктуры. На гэтыя мэты ў бюджэце прадугледжана Br2 млрд з ростам на 7,6 % да ацэнкі гэтага года.

### РОСТ ЭКСПАРТУ І ІНВЕСТЫЦЫЙ

Як адзначыў у размове з журналістамі **міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЁРСТАЎ,** павышэнне зарплаты ў 2025 годзе будзе ісці ў два этапы. «Першы — павелічэнне базавай стаўкі для ўсіх катэгорый бюджэтнікаў, — удакладніў ён. — Другі — павелічэнне надбавак асобным катэгорыям работнікаў. На гэтыя мэты будзе накіравана больш як Br1 млрд. Задачы па падтрыманні на пэўным узроўні заробкаў медыкаў, росту зарплат настаўнікаў, іншых катэгорый бюджэтнікаў будуць выконвацца дыферэнцыравана праз надбаўкі. Рост гэтых надбавак значны».

Па яго словах, павышэнне базавай стаўкі для бюджэтнікаў плануецца з 1 студзеня. Другі этап павышэння зарплат чакаецца ў верасні.

Кажучы аб разглядзе асноўных параметраў развіцця нашай краіны на наступны год, **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР** адзначыў, што дзяржава зыходзіць у першую чаргу з ацэнкі знешніх і ўнутраных фактараў. «Закладваем перадумовы, што мы павінны расці тэмпамі вышэй за сусветныя, — адзначыў ён. — Асноўныя нашы партнёры на наступны год плануюць тэмпы ў межах 103-104 %. Вышэй за гэтыя параметры мы на наступны год фактычна і закладваем рост валавога ўнутранага прадукту».

Так, рост беларускай эканомікі ў 2025 годзе запланаваны на ўзроўні 4,1 %. На гэты параметр плануецца выходзіць за кошт трох асноўных кірункаў. Гэта вытворчая, экспартная і інвестыцыйная праграмы.

«У вытворчай праграме разам з усімі міністэрствамі і канцэрнамі-галінавікамі вызначылі планы па больш як 40 таварных пазіцыях, — паведаміў Юрый Чабатар. — У тым ліку і рэалізацыю гэтых планаў у выглядзе канкрэтных будучых кантрактаў і экспартных паставак. Экспарт на наступны год павінен прырасці крыху больш як на 5 %. Вызначылі і асноўныя рынкі: нашы асноўныя гандлёвыя партнёры — Расія, Кітай і ў цэлым рынак Азіі, іншыя краіны далёкай дугі. Мы разумеем, якія пастаўкі трэба ажыццяўляць, у якім аб'ёме і ў якія тэрміны. Сумесна з нашымі калегамі з галін пастаянна маніторым пацверджанасць экспартных кантрактаў. У большасці галін яна дастаткова высокая. Раз на квартал глядзім, якія яшчэ кантракты ў найбліжэйшай перспектыве ёсць. Настойліва імкнёмся да рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых на самым высокім узроўні».

Асаблівую важнасць мае інвестыцыйная праграма. «Яна не сыходзіць у нас з парадку дня ўжо не першы год, — падкрэсліў міністр эканомікі. — Ад інвестыцый залежыць развіццё прадпрыемстваў, якасць прадукцыі, канкурэнтаздольнасць, стварэнне новых вытворчасцяў. Па інвестыцыях мы закладваем рост больш як 7 %. Ключавое — рэалізацыя інвестыцыйных праектаў. Мы падрыхтавалі больш як 600 разам з рэгіёнамі. Звярнулі ўвагу на развіццё індустрыі адпачынку, пачалі адпрацоўваць праекты ў рэгіёнах, каб ствараць не толькі вытворчую базу, але і інфраструктуру для турызму. Тры праекты мы ўжо ўключылі, у прапрацоўцы — яшчэ два. Спадзяюся, мы паскорымся, бо гэта сфера дастаткова ёмістая ў плане магчымасцяў росту».

У плане прыросту інвестыцый Беларусь размежоўвае на ўсе крыніцы: і ўнутраныя, і знешнія. «Вядома, у большай частцы звяртаем увагу на айчынных інвестараў, разлічваем на ўласныя сілы, — сказаў кіраўнік Мінэканомікі. — Нарошчваем узаемадзеянне з нашымі асноўнымі партнёрамі — Кітаем, Расіяй. Адпрацоўваем з імі праекты, ёсць адпаведныя задумкі».

**Паводле БелТА.**

Па сутнасці



# ЖНІВЕНЬ. ЧАС ДУМАЦЬ І РАБІЦЬ ВЫСНОВЫ

Ёсць падзеі, што застануцца ў гісторыі, а ёсць такія, што ўздзейнічаюць на гісторыю. Жнівень — час збіраць ураджай з палеткаў. Своеасаблівы ўраджай мы сабралі і чатыры гады таму. Самі яго вырасцілі, самім прыйшлося і ацаніць. Галоўная выснова — сама сістэма ўлады аказалася моцнай. Вертыкаль. Зразумела, што гэта заслуга Прэзідэнта, ён выбудаваў саму сістэму, ён першы і стаў у лінію абароны. Былі паплечнікі, але была і розная рэакцыя на падзеі. Тэхналогіі кіравалі настроем і паводзінамі людзей. Ахілесава пята беларусаў — міласэрнасць, — на яе і нацыснулі. Жахі пра жудаснае збіццё... Вядома, у вулічным супрацьстаянні не да сантыментаў, але да сённяшняга дня некаторыя ў палоне тых фэйкаў. І медыя кожны факт маны, нават самай неверагоднай, даводзіцца аправяргаць. Гэта як работа супрацьпаветранай абароны — дроны: нам трэба нейтралізаваць фэйкі, але ж іх столькі, што некаторыя не стрымаць.

Фэйкі, атмасфера лжывай «большасці», а таксама звычайнае прыстасавальніцтва далі магчымасць зацягнуцца таму пратэсту. Але час расставіў усе кропкі над беларускім «і». Так, патрэбен быў час, каб уцяміць, што беларускі народ апынуўся на лініі наступлення і націску на Усход. Не мы, а яны сцягваюць да нашых граніц тэхніку і шматлікія вайсковыя фарміраванні. Не мы, а метраполіі калектыўнага Захаду, а менавіта Украіна, Польшча, краіны Балтыі гадавалі, песцілі і працягваюць падтрымліваць апазіцыю супраць Мінска. І філантропія тут ні пры чым. Каб гэта ўцяміць, каб зразумець, што нас намагаюцца ўцягнуць у бойку,ператварыць нашу краіну па ўкраінскім сцэнарыі таксама ў палігон проксі-вайны, быў патрэбен час. І вось той так неабходны час падаравалі нам сілавікі. Хай нават праз брутальны адказ на вулічныя выхадкі. Інакш «мірныя» захапілі б уладу, устанавілі новы апазіцыйны рэжым. І дзякуючы «мірным пераменам» мы б апынуліся ў акопах. Вось гэта барацьба супраць Расіі цяпер аформлена ў ваенное супрацьстаянне. І мы таксама маглі б быць уцягнуты. А тое, што засталося, падзялілі б, мабыць, паміж Польшчай, Украінай і Літвой.

Трэба зразумець, што не палітычныя альбо эканамічныя ўмовы сталі першапрычынай. Мы дазволілі чужынцам выхаваць некаторую частку грамадства, якая ўсім не задаволена. Калі казаць пра эканамічныя прычыны, то дастаткова глянуць на выгляд беларускіх гарадоў, аўтамабільны трафік і саміх беларусаў — паляпшаецца. Адназначна паляпшаецца, мо не з такой хуткасцю, як хацелася б. Але мы да гэтага адносімся як да паветра. Ёсць — і ўсё. Калі казаць пра палітычныя прычыны, то ад апанентаў улады ні тады, ні цяпер не было чуваць дзейсных прапаноў беларускаму грамадству. Лузеры апазіцыі нават сваіх паплечнікаў адправілі на бойку. Збеглыя радыкалы і беспрацоўныя апынуліся ў нацыяналістычных харугвах і карпусах, што цяпер гінуць на франтах Украіны... Змагары! Тым, хто апынуўся за кратамі, пашчасціла. Яны пішуць звароты да Прэзідэнта, і іх чакае памілаванне. Шанц на тое, каб наладзіць новае жыццё. Але вось, у чым справа: атрымлівацца, яны здрадзілі сваім ідэям і ідэалам. А ці былі яны ў іх? А яны ж яшчэ вялі людзей за тым, што самі цяпер пакінулі. Змагары...

Дык у чым жа справа? У тым, што мы далі магчымасць вырасціць з нашых людзей чужынцаў. Тых, хто карыстаецца краінай, але не любіць яе. Тых, хто выцягвае ўсе сокі з Беларусі, ганьбячы яе. Гэта паводзіны, філасофія ракавай клеткі. А мы гэтага не заўважалі, было зручна не заўважаць. Кожнаму на сваім узроўні талерантна не заўважаць і вандраваць па заходніх фуршэтах і заморскіх кавярнях. Губляцца перад безасобавай глабалізацыяй, трапляючы ў палон касмапалітызму. Ні агульны камфорт, ні дасягнутыя мэты ўстойлівага развіцця, ні даступнасць заморскіх брэндаў, ні палкоўнік Сандэрс на афішах Мінска — уся гэта стэрэатыпная атмасфера забяспечанасці і бяспекі не гарантуюць мір. Бо пакуль не будзе кансалідаванай ідэі, увесь натоўп, што цяпер спакойна шпацыруе па прыгожых вуліцах сталіцы, хціўвы тэхнолагі могуць накіраваць у іншае русла. Ізноў будуць таптаць кветкі, пасаджаныя намаганнямі ўсіх.

Таму нам патрэбны такія патэрны, што не дазволяць наша грамадства зноў, хоць і на кароткі час, ператварыць у натоўп.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

З нагоды

# Дзень беларускага пісьменства: якім стане трыццаць першае свята ў сваёй дваццаць сёмай сталіцы?

**Каля тydня засталося да XXXI Дня беларускага пісьменства. Традыцыя адзначаць яго распачата ў 1994 годзе. За гэты час яго сталіцамі станавіліся 26 беларускіх гарадоў і паселішчаў, некаторыя з іх — двойчы, а старажытны Полацк — тройчы. Сёлета Дзень беларускага пісьменства прымае Брэсцкая вобласць, горад Івацэвічы. Пра тое, якія мерапрыемствы пройдуць у дваццаць сёмай сталіцы свята, ішла гаворка ў Нацыянальным прэс-цэнтры.**

## ПАКАЗАЦЬ НАЙЛЕПШЫЯ НАБЫТКІ

Як заўважыў першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй Кунцэвіч, Дзень беларускага пісьменства іграе значную ролю ва ўмацаванні і захаванні нашай культурнай спадчыны, найбагацейшых традыцый пісьменства і кнігадрукавання. Нашай краіне ёсць чым ганарыцца, і свята дазваляе паказаць найбольш яскравыя дасягненні.

Сёлета Дзень беларускага пісьменства праходзіць з улікам найважнейшых юбілейных дат рэспублікі, такіх як 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 30-годдзе інстытута прэзідэнцтва, 30-годдзе Канстытуцыі РБ. Таксама на свяце ў творчым антуражы згадаюць імёны класікаў, чые юбілеі адзначаюцца сёлета. Сярод іх — Аркадзь Куляшоў, Міхась Лынькоў, Іван Чыгрынаў. Падчас урачыстасцяў будзе адлюстравана і тэматыка Года якасці.

Рыхтуецца сур'ёзная культурная і дзелавая праграма. На працягу двух дзён свята — 31 жніўня і 1 верасня — пройдзе каля 70 святочных мерапрыемстваў. Але асобныя з іх пачаліся ўжо. Так, 20 жніўня былі падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка», у якім узялі ўдзел каля 15 тысяч беларускіх школьнікаў. У рамках Дня беларускага пісьменства ў Івацэвічах пройдзе гала-канцэрт пераможцаў гэтага конкурсу, а тэлеверсію фіналу на канале СТБ пакажуць у Дзень ведаў.

Традыцыйна старт святочным мерапрыемствам дасць рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў».




Яна распачнецца 28 жніўня і пройдзе па маршруце Мінск — Святое Поле побач з вёскай Загор'е (Баранавіцкі раён) — Ляхавічы — Пінск — Іванава — Драгічын — Белаазёрск і завершыцца літургіяй у Івацэвічах першага верасня.

30 жніўня у Палацы Рэспублікі пройдзе міжнародны круглы стол «Час выбраў нас», які збярэ беларускіх і замежных пісьменнікаў, грамадскіх і культурных дзеячаў.

У дваццаць сёмай сталіцы Дня беларускага пісьменства на працягу двух дзён будуць працаваць інтэрактыўныя пляцоўкі грамадскіх аб'яднанняў, публічных бібліятэк Брэсцкай вобласці, рэгіянальных СМІ.

У сувязі з тым, што горад прымае свята ўпершыню, праграма падрыхтавана так, каб гасцей пазнаёміць з гісторыяй і здабыткамі гэтай зямлі. Так, 31 жніўня пройдзе навукова-практычная канферэнцыя «Івацэвіцкія чытанні», якую Міністэрства інфармацыі праводзіць разам з Нацыянальнай акадэміяй навук. Будзе працаваць пляцоўка, якая пазнаёміць з турыстычным патэнцыялам Брэсцкай вобласці і Івацэвіцкага раёна. Па заказе Міністэрства інфармацыі былі выдадзены кнігі, прысвечаныя гэтай зямлі і яе ўраджэнцам: «Івацэвіцкі край» (на беларускай, рускай, англійскай мовах) і «Мы помнім» (серыя «Беларусь літаратурная»).

Свае экспазіцыі на свяце прадставяць Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, літаратурныя музеі, замкавы комплекс «Мір» і музей-запаведнік «Нясвіж».

У рамках свята пройдзе Фестываль кнігі і прэсы, які будзе прадстаўлены на чатырох тэматычных пляцоўках. На дзвюх з іх — «Сучасная Беларусь» і «Беларусь памятае» будуць размешчаны тэматычныя выстаўкі, прысвечаныя 30-годдзю беларускай дзяржаўнасці і Канстытуцыі Беларусі, 80-годдзю вызвалення. Упершыню на Дні беларускага пісьменства на тэматычнай пляцоўцы «Зроблена ў Беларусі» будуць паказаны найлепшыя беларускія выданні, якія з'яўляюцца пераможцамі міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі». А на інтэрактыўнай пляцоўцы «Слова пісьменніка» пройдуць прэзентацыі, аўтограф-сесіі, творчыя сустрэчы з аўтарамі.

## СЛОВА — ПІСЬМЕННІКАМ

Асобную экспазіцыю да свята рыхтуе «Белкніга», дзе будуць прадстаўлены навінкі дзяржаўных выдавецтваў. Як паведаміў генеральны дырэктар «Белкнігі» Уладзімір Матусевіч, цэнтральнае месца зоймуць выданні, звязаныя з тэмай Вялікай Айчыннай вайны, трагедыяй і подзвігам беларускага народа. Заўсёды вялікі інтарэс на свяце да дзіцячай літаратуры, таму тут можна будзе пазнаёміцца і набыць як кнігі казак, так і літаратуру, якая спатрэбіцца ў навучальным працэсе. Адным з новых




інструментаў для прасоўвання беларускіх кніг павінен стаць мабільны дадатак «Белкнігі», пры дапамозе якога можна выбраць і набыць сучасныя выданні.

Як заўважыла першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах, разам з Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкай Дзень пісьменства з'яўляецца для аўтараў галоўным святам. Падрыхтоўка да яго вядзецца на працягу ўсяго творчага года, і сюды пісьменнікі прыедуць са сваімі новымі кнігамі. Першымі на пляцоўцы «Слова пісьменніка» заявяць пра сябе брэсцкія пісьменнікі, паступова да іх далучацца калегі, якія прыедуць з розных куткоў Беларусі. Чакаецца, што ў пісьменніцкай дэлегацыі будзе каля 140 чалавек. Тэматыка іх выступленняў — «Беларусь у маім сэрцы», «Слова незалежнай Беларусі», «Вечнасць радка як вечнасць жыцця». У раённую бібліятэку будзе перададзена падборка з новых кніг, у тым ліку і са знакавага літаратурнага праекта «Анталогія краін СНД». На свята прыедуць і прадстаўнікі таварыства «Беларуска-малдаўскае сяброўства». Дарэчы, зусім нядаўна пабачыла свет кніга «Малдаване ў Беларусі», якая расказвае пра людзей, для якіх наша краіна стала другім домам. Навінка таксама будзе перададзена ў мясцовую бібліятэку.

У вялікай зале Івацэвіцкага Дома культуры пройдуць сустрэчы з народным пісьменнікам Беларусі Мікалаем Чаргінцом, народнай артысткай БССР Марыяй Захарэвіч і заслужаным дзеячам культуры БССР, народным артыстам Эдуардам Ханком.

## ПРЭТЭНДЭНТЫ СТАНУЦЬ ЛАЎРЭАТАМІ

У першы дзень свята а 20 гадзіне на галоўнай сцэне распачнецца ўрачыстая цырымонія адкрыцця. Падчас яе будуць узнагароджаны пераможцы «Нацыянальнай літаратурнай прэміі». Конкурс, у якім вызначаюцца найлепшыя аўтары ў розных намінацыях (і ў тым ліку адзначаюцца літаратурныя дэбюты), праводзіцца з 2015 года. У розныя гады яго пераможцамі станавіліся Мікалай Чаргінец, Мікола Мятліцкі, Георгій Марчук, Алесь Жук, Мар'ян Дукса, Уладзімір Саламаха, Алесь Карлюкевіч, Віктар Шніп і многія іншыя таленавітыя пісьменнікі. «Калі паглядзець на імёны пераможцаў за ўвесь час, можна сказаць, што, безумоўна, гэты конкурс не проста прэстыжны, а адзін з самых вядомых і прадстаўнічых», — заўважыў дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», старшыня журы Нацыянальнай літаратурнай прэміі Алесь Бадак. Арганізатарамі літаратурнага спаборніцтва з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі, Мінсітэрства культуры, Міністэрства адукацыі і Саюз пісьменнікаў Беларусі. Сёлета на конкурс было пададзена 49 заявак, і гэта з улікам, што іх прадстаўляюць не толькі самі аўтары, але і выдавецтвы і бібліятэкі, а значыць, кнігі ўжо праходзяць сур'ёзны адбор. Сёлета больш за ўсё прэтэндэнтаў на званне найлепшай кнігі было прадстаўлена ў намінацыях «Найлепшы твор прозы» і «Літаратура для дзяцей і юнацтва». Дарэчы, такая тэндэнцыя назіраецца апошнія гады, хаця, як заўважыў Алесь Бадак, Беларусь традыцыйна лічыцца краінай паэтаў. На трэцім месцы па колькасці пададзеных заявак стала намінацыя «Найлепшы публіцыстычны твор». «Гэта невыпадкова, сёння час публіцыстыкі, аналізу сітуацыі, у якой мы жывём. Вострае мудрае слова публіцыста вельмі важнае», — упэўнены Алесь Бадак.

Кнігі лаўрэатаў будуць прадстаўлены на Фестывалі кнігі і прэсы на асобным стэндзе, а таксама на фэсце пройдуць сустрэчы з лаўрэатамі Нацыянальнай прэміі розных гадоў.

Першага верасня ў адзіннаццаць гадзін распачнецца літаратурна-мастацкая імпрэза Саюза пісьменнікаў Беларусі, а пасля яе пройдзе ўрачыстае ўзнагароджанне журналістаў, якія перамаглі ў рэспубліканскім творчым конкурсе «Хвала рукам, што пахнуць хлебам». Гэты конкурс ужо не першы год праводзіцца Міністэрствам інфармацыі, Беларускім прафесійным саюзам работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму. На ім адзначаюць найлепшыя журналісцкія работы, прысвечаныя ўборачнай кампаніі.

Урачыстая цырымонія закрыцця свята запланавана на 14.00. У рамках яе будзе перададзены вымпел сталіцы Дня беларускага пісьменства наступнаму населенаму пункту. У 2025 годзе ім стане горад Ліда.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Парламент Ірана зацвердзіў кабінет міністраў Пезешкіана



Іранскі парламент зацвердзіў поўны склад новага кабінета міністраў прэзідэнта Масуда Пезешкіана. Аб гэтым паведаміла іранскае дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва Mehr. Так, новым кіраўніком МЗС стаў Абас Аракчы — вядомы дыпламат, экс-намеснік міністра замежных спраў. Ён таксама працаваў паслом у шэрагу краін, напрыклад, у Фінляндыі і Японіі. Іграў ключавую ролю ў перагаворах па заключэнні ядзернай здзелкі (Сумеснага ўсёабдымнага плана дзеянняў па іранскай ядзернай праграме) у 2015 годзе. Сілавыя ведамствы ў новым урадзе таксама ўзначалілі вядомыя ў Іране фігуры. Так, сваю пасаду міністра інфармацыі (разведкі) захаваў Ісмаіл Хаціб — іранскі багаслоў, які займаў пасады ў структуры Корпуса вартавых ісламскай рэвалюцыі. На думку многіх экспертаў, ён уваходзіць у блізкае кола цяперашняга Вярхоўнага лідара Ірана Алі Хаменеі.

## Апасенні амерыканцаў наконт страты работы дасягнулі максімуму за 10 гадоў

Аб гэтым паведаміла MarketWatch са спасылкай на вынікі апытання Федэральнага рэзервовага банка Нью-Ёрка. Апытанне паказала, што сярэдні паказчык верагоднасці страты работы на працягу наступных чатырох месяцаў вырас у ліпені да 4,4 працэнта ў параўнанні з 3,9 працэнта ў тым жа месяцы летась. Гэта самы высокі ўзровень ад пачатку вядзення разлікаў у 2014 годзе. Даследаванне таксама паказала на рэзкае павелічэнне колькасці саіскальнікаў. Доля рэспандэнтаў, якія заявілі аб пошуках работы ў апошні месяц, вырасла да 28,4 працэнта, што з'яўляецца максімумам з сакавіка 2014 года. Між тым работнікі сталі менш задаволены сваёй бягучай работай: задаволенасць заработнай платай, ільготамі і магчымасцямі прасоўвання па службе знізілася. Беспрацоўе ў ЗША ў ліпені павялічылася да 4,3 працэнта ў параўнанні з 4,1 працэнта месяцам раней. Гэта найвышэйшы ўзровень з кастрычніка 2021 года. Пры гэтым уздым стаў нечаканасцю для большасці аналітыкаў.



## У Германіі штодня ўчынялася звыш 2 тысяч злачынстваў



У ФРГ у мінулым годзе ў дзень учынялася ў сярэднім каля 2,2 тысячы злачынстваў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на выданне Bild. Згодна з гадавой справаздачай Федэральнага ведамства крымінальнай паліцыі краіны, усяго за гэты перыяд у краіне ўчынілі больш за 790 тысяч правапарушэнняў. Такім чынам, колькасць злачынстваў, учыненых летась, перавысіла аналагічны паказчык за 2022 год на 88 тысяч, пабіўшы таксама папярэдні антырэкорд 2012 года. У прыватнасці, у мінулым годзе зафіксавана 389,3 тысячы злачынстваў, звязаных з парушэннем міграцыйнага заканадаўства, — іх прырост у параўнанні з годам раней склаў 38,3 працэнта. Колькасць дэпартацый мігрантаў з краіны вырасла на 17,2 працэнта і склала 21,2 тысячы выпадкаў. Колькасць гвалтоўных злачынстваў летась дасягнула 31,8 тысячы, з іх 1728 правапарушэнняў было ўчынена супрацоўнікамі паліцыі. Раней выданне Bild апублікавала апытанне, праведзенае сацыялагічным інстытутам INSA, паводле якога амаль кожны другі жыхар Германіі (45 працэнтаў) на працягу апошніх пяці гадоў адчувае сябе ўсё менш бяспечна ў сваёй краіне.

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў працуюць у рэгіёнах

# Ад школьнага кірмашу да «Спораўскіх сенакосаў»

**Парламентарый Юрый НАРКЕВІЧ бывае там, дзе працуюць, вучацца, лечацца, адпачываюць выбаршчыкі**



Дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Юрый Наркевіч выбраны па Пружанскай акрузе № 9. У склад акругі ўваходзяць Пружанскі і Бярозаўскі раёны. Старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы, гандлі і будаўніцтве плённа працуе ў сваёй акрузе. Юрый Наркевіч бывае ў гаспадарках, на прамысловых прадпрыемствах, у навучальных і медыцынскіх установах, наведвае гандлёвыя аб'екты, удзельнічае ў пасяджэннях райвыканкамаў і сельсаветаў. У калектывах, на прыёмах грамадзян размова ідзе аб надзённых праблемах.

Самымі прыемнымі момантамі работы ў акрузе дэпутат называе свае візіты да ветэранаў, шаноўных людзей акругі. Напрыклад, у маі, калі мы адзначалі Дзень Перамогі, Юрый Іосіфавіч пабываў у гасцях у ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Марыі Аляксандраўны Бабрук у Шаняўскім сельсавеце Пружанскага раёна. Летась жанчына адзначыла 100-гадовы юбілей, але свайго дэпутата сустрэла, як той казаў, пры поўным парадзе. Шчыра дзякавала за ўвагу, падарункі і нават разам з усімі спявала сваю любімую «Кацюшу».

У Бярозаўскім раёне адным з адрасоў наведвання парламентарыя стаў завод «Бярозабудматэрыялы». Там ужо амаль паўгода працуе новая комплексная тэхналагічная лінія па вытворчасці буйнафарматнай керамічнай пліткі і керамаграніту. Бярозаўская плітка вядомая ў краіне і карыстаецца попытам у пакупнікоў. Дэпутату прадэманстравалі ўсе этапы вытворчасці, ён пазнаёміўся з умовамі працы людзей, абмеркаваў з яго кіраўніцтвам асаблівасці работы ў сучасных умовах, пацікавіўся далейшымі планамі развіцця вытворчасці. Яшчэ праз месяц дэпутат пабываў у фірменным магазіне прадпрыемства, пазнаёміўся з асартыментам прадукцыі, пагаварыў з пакупнікамі.

А на пасяджэнні Бярозаўскага райвыканкама найбольш засяродзіліся на праблемах. На пасяджэнні прысутнічаў таксама старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Брэсцкага аблвыканкама Андрэй Слуцкі. Юрый Наркевіч падкрэсліў, што Бярозе жыццёва неабходная чацвёртая школа:

— Гэтай ідэі ўжо нямала гадоў. Але прыйшоў час яе рэалізаваць. Райцэнтр забудоўваецца вельмі актыўна. Што датычыцца кварталаў індывідуальнай забудовы, яны літаральна наступаюць на пяты праектам. Людзі будуюць дамы, паляпшаюць жыллёвыя ўмовы, у сем'ях нараджаюцца дзеці. Нельга дапускаць вялікія чэргі ва ўстановы адукацыі. Усе ў Бярозе чакаюць новую сучасную школу, — заключыў дэпутат.

На мінулым тыдні ў ходзе рабочай паездкі па Пружанскім раёне дэпутат наведаў бальніцу сястрынскага догляду ў Сухопалі, дзе пазнаёміўся са спецыфікай работы ўстановы, умовамі пражывання хворых. Парламентарый падкрэсліў, што падтрымка адзінокіх састарэлых грамадзян з'яўляецца адным з асноўных кірункаў сацыяльнай палітыкі дзяржавы. У сацыяльную палітыку таксама арганічна ўпісваецца клопат пра падрыхтоўку школьнікаў да новага навучальнага года. Дэпутат вывучыў пытанне на прыкладзе суседняга з Сухопалем аграгарадка Муравы. Тут якраз праходзіў вясковы школьны базар.

У ходзе экалагічнага фестывалю «Спораўскія сенакосы» Юрый Наркевіч падтрымліваў каманды касцоў, праяўляў актыўнасць на многіх лакацыях фэсту.

— Фестываль «Спораўскія сенакосы», як і галоўны яго сімвал — вяртлявая чаротаўка, — даўно сталі брэндамі Бярозаўскага раёна, — сказаў дэпутат. — Мы любім гэту птушку, любім прыроду і шмат робім для таго, каб перадаць гэтае багацце нашым будучым пакаленням. Бярозаўскі раён мае добры прамысловы патэнцыял, развіту аграрную галіну. Акрамя таго, раён мае ўсе падставы ганарыцца ўнікальнай прыродай, перш за ўсё, сваімі балотамі. Адзін гектар балота, як вядома, паглынае тону вуглякіслага газу, балоты — лёгкія нашай планеты. Фестываль некалі быў задуманы як нагода прыцягнуць увагу да праблемы захаванасці балот і са сваёй задачай спраўляецца. Год ад года паляпшаецца праграма фестывалю, ён збірае ўсё больш людзей.

# «Захаванне краіны магчыма толькі пры кансалідацыі беларусаў»

**Такі пасыл дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Алег РАМАНАЎ лічыць адным з галоўных у сваёй рабоце парламентарыя.**



У дэпутатаў цяпер гарачая пара. Гэта той перыяд, калі ідзе адказная і насычаная падзеямі работа ў акругах. Вось і ў рабочым графіку Алега Раманава назначаны прыёмы, сустрэчы ў працоўных калектывах, выезды да працаўнікоў жніва, дыялогі з моладдзю і многае іншае. Літаральна напярэдадні мінулага тыдня дэпутат сустрэўся са старшакласнікамі Гродзенскага раёна ў аздараўленчым летніку «Сузор'е».

— Сёння моладзі трэба паведаміць дакладна, чым жыве наша Беларусь, што адбываецца ў свеце. Маладыя людзі з-за свайго максімалізму, недахопу ведаў схільныя да імпульсіўных рашэнняў, не заўсёды прадуманых і адказных. Таму важна, каб моладзь сустракалася з людзьмі, якія па сваёй прафесійнай дзейнасці маюць досвед у грамадска-палітычных справах, дапамагаць ім сацыялізавацца. Трэба больш грунтоўна пазнаваць грамадства, у якім жывеш, і больш правільна і адэкватна ў ім дзейнічаць, — патлумачыў сваю пазіцыю дэпутат.

Адной з дзейсных форм узаемадзеяння з выбаршчыкамі Алег Раманаў лічыць асабістыя прыёмы. Часам прыходзіцца разбірацца ў складаных пытаннях, звязаных з нерухомасцю альбо зямельнымі ўчасткамі. Разам з тым ёсць і звароты з просьбай нападзейнічаць у паляпшэнні той ці іншай інфраструктуры. Напрыклад, нядаўна такі зварот датычыў рамонту баскетбольнай пляцоўкі ў Гродне. Алегу Раманаву як намесніку старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі даводзіцца выслухоўваць просьбы і пажаданні, звязаныя з яго непасрэднай работай у дадзенай камісіі.

— Бывае так: чалавек лічыць, што яго правы ў нечым ушчэмлены, і просіць аказаць падтрымку. Такім чынам можа суадносіцца работа ў камісіі і ў акрузе. Бо чалавек мае права на здаровае, бяспечнае і шчаслівае жыццё, — канстатуе дэпутат. — І тыя сустрэчы, якія мы праводзім у працоўных калектывах, накіраваны на тое, каб даводзіць да людзей палітыку нашай дзяржавы — канструктыўную, міралюбівую, стваральную, якая накіравана на тое, каб забяспечыць нармальнае жыццё, даць магчымасць развівацца, абараняць усе яго неад'емныя правы.

Дэпутат звяртае ўвагу на тэму інфармацыйнай бяспекі. Аб гэтым, дарэчы, ішла гаворка падчас нядаўняй сустрэчы з калектывам сельскагаспадарчага прадпрыемства «Галынка» Гродзенскай вобласці. Суразмоўнік прызнаецца, што і сам у якісьці момант захапіўся тэлеграм-каналамі і мог гадзінамі чытаць навіны. Але раптам зразумеў, што гэта не ўзбагачае, а толькі шкодзіць. Тады і было прынята рашэнне засцерагчы сябе ад празмернага патоку навін, а пакінуць некалькі афіцыйных каналаў, якія даюць правераную інфармацыю ў сціслым выглядзе. «Кожны павінен клапаціцца аб інфармацыйнай гігіене», — робіць выснову дэпутат і акцэнтуе ўвагу на тым, што сёння няма больш надзейнай крыніцы інфармацыі, чым дзяржаўныя СМІ. Яны не імкнуцца за кошт фэйкаў і лжы набраць аўдыторыю, а абапіраюцца толькі на праўду і абараняюць нацыянальныя інтарэсы.

Важным пунктам у сваёй рабоце Алег Раманаў лічыць узаемадзеянне з грамадскімі арганізацыямі. Іх ролю нельга недаацэньваць. Бо, па сутнасці, гэта тыя сілы, якія выбудоўваюць гарызантальныя сувязі ў грамадстве, згуртоўваюць яго, дазваляюць людзям сумесна рэалізоўваць нейкія праекты, актыўнасці. Увогуле, дэпутат стараецца данесці свой галоўны пасыл: поспех краіны залежыць ад кансалідацыі грамадства. Прычым не толькі поспех, але і само захаванне дзяржавы без гэтага проста немагчыма.

— Цяпер любая раз'яднанасць, канфлікты, унутраныя звады — не проста шлях да аслаблення, гэта шлях да разбурэння. Таму асноўная задача — гэта адзінства народа, агульнае прыняцце чалавечых каштоўнасцяў і на гэтай аснове паскоранае сацыяльна-эканамічнае развіццё, — лічыць Алег Раманаў.

# Падарунак ад дэпутата

**Хутка новы навучальны год, і вучні ды іх бацькі актыўна рыхтуюцца да гэтай падзеі. Традыцыйна дэпутат Палаты прадстаўнікоў Наталля ТАРАСЕНКА наведала сем'і, дзе выхоўваюцца дзеці-інваліды, і зрабіла ім падарункі да школы.**

— Наша грамадскае аб'яднанне «Беларускі саюз жанчын» штогод праводзіць акцыю «Збяром партфель разам», і я як член гэтай арганізацыі трэці год удзельнічаю ў дабрачынным марафоне, — расказвае дэпутат. — Адрасы сямей, дзе выхоўваюцца дзеці-інваліды, якія пойдуць у першы клас, мне падказваюць у Магілёўскім раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, які падтрымлівае акцыю. Яны жывуць у вёсках Магілёўскага раёна: гэта і Вейна, і Васход, і Мяжысеткі, і Палавінны Лог, і Бутрымаўка. Наведваю прыкладна 10 сямей. Заўсёды наведваю маці з сур'ёзнай інваліднасцю, якая выхоўвае двух дачок. Жанчына фактычна не можа выйсці з кватэры, патрэбна дапамога. Таму прыязджаю туды і раблю дзецям падарункі, хаця яны ўжо і не першакласнікі. Хочацца, каб сустрэчы былі не фармальныя, каб дзеці ім радаваліся. Падарункі куплю сама, падбіраю рэчы на працягу года, дзесьці спадабаліся размалёўкі для дзяўчынак або нешта цікавае ўбачыла для хлопчыкаў. І заўсёды кранае, калі малыя зазіраюць у пакет і ў захапленні ўсклікаюць: «Клас!» На жаль, ёсць дзеці з такімі паталогіямі, якія нават не ў стане сказаць гэтыя словы. Яны вельмі хвалююцца ў чаканні вялікай у іх жыцці падзеі.

Дэпутат заўважае, што ў сем'ях, дзе растуць дзеці, якія маюць нейкія праблемы са здароўем, заўсёды асаблівая атмасфера. Бацькі там больш шчырыя і радуюцца, здаецца, дробязям. Іх дзецям бывае не проста сацыялізавацца ў калектыве, і трэба шмат цярпення і намаганняў, каб пераадолець цяжкасці. Асабліва важна падтрымаць дзяцей, якія ідуць у першы клас, каб яны селі за парту з добрым настроем, не адчулі расчаравання.

— На што мы не арыентуемся, дык гэта на дабрабыт сям'і, — кажа Наталля Тарасенка. — Нашы візіты — гэта знак увагі, напамін пра тое, што дзяржава думае пра ўсіх. Тым, у каго цяжкая сямейная сітуацыя, асабліва важны нават маленькі клопат. У іх не заўсёды атрымліваецца кудысьці выехаць і нешта купіць. Мы робім невялікі падарунак, а далей яны ўжо самі дакупляюць усё, што неабходна. На першых парах хопіць, а потым бацькі будуць арыентавацца на тое, што ім скажуць дакупіць у школе. Заўсёды ўражваюць сем'і, якія робяць усё магчымае для развіцця свайго дзіцяці. Паталогіі бываюць вельмі сур'ёзныя, разумею, наколькі гэтым дзецям будзе складана вучыцца нават у спецыяльным класе. Заўсёды з асаблівым пачуццём стаўлюся да бацькоў такіх дзяцей. Стараюся дапамагчы усім парадай, справай. Пытаюся, ці ёсць неабходнасць аказання нейкай экстраннай дапамогі. Шмат хто звяртаецца менавіта па школьных пытаннях, памятаючы, што я калісьці ўзначальвала райаддзел па адукацыі. Некаторыя просяць парады як у педагога.



Падчас работы ў акрузе дэпутат наведала не толькі сем'і, але і школы, глядзела, як яны падрыхтаваліся да новага навучальнага года. Сёлета ў Магілёўскім раёне праводзілася асабліва шмат капрамонтаў устаноў адукацыі. У Кадзінскай школе капрамонт быў летась, сёлета праведзены яшчэ і касметычны. Дэпутат пабывала там і засталася задаволенай. Да гэтай школы ў яе асаблівыя адносіны: ёй яна прысвяціла больш за 20 гадоў сваёй педагагічнай дзейнасці, пачынала тут у якасці настаўніцы пачатковых класаў, а потым узначаліла яе. Тут жа ў рамках праекта «ШАГ да поспеху» ў яе адбылася сустрэча з дзецьмі з Белгародскай вобласці, якія адпачываюць у дзіцячым аздараўленчым лагеры «Каласок» у Магілёўскім раёне.

— Хлопчыкі і дзяўчынкі задавалі мне шмат пытанняў, — кажа суразмоўніца. — Яны з увагай слухалі пра тыя праекты, над якімі мы працуем. Я расказала пра Закон «Аб генацыдзе беларускага народа», пра тое, што дагэтуль адкрываюцца новыя факты злачынстваў, якія адбываліся на нашай зямлі. А напрыканцы нашай сустрэчы падарыла ім на памяць кнігі пра Беларусь.

— Нам трэба цаніць тое, што мы маем, бо гэта вельмі проста страціць, — рэзюмуе парламентарый. — Вакол нас адбываюцца вельмі трагічныя падзеі, і трэба быць мужнымі і адзінымі ў сваіх памкненнях. У нашай краіне шмат робіцца для таго, каб дзеці мелі роўныя правы і магчымасці. Каб кожны з іх мог рэалізавацца і знайсці занятак па душы і прынесці сваёй вучобай, дзейнасцю, работай карысць грамадству.

*Матэрыялы падрыхтавалі Святлана ЯСКЕВІЧ, Маргарыта УШКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ.*
*Фота з тг-каналаў і сайтаў дэпутатаў.*

# Найлепшы сябар школьніка

## ПАПУЛЯРНЫЯ І ЗАПАТРАБАВАНЫЯ

Да пачатку новага навучальнага года засталіся лічаныя тыдні, таму ва ўсіх, хто задзейнічаны ў працэсе забеспячэння падручнікамі і дапаможнікамі школьнікаў, гарачая пара. Аднак **начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Міністэрства інфармацыі Уладзімір АНДРЫЕВІЧ** упэўнены, што ўсе запланаваныя да выпуску школьныя выданні дзеці атрымаюць своечасова.

— Трэба паспець да 1 верасня выдаць усе неабходныя падручнікі. Паліграфкамбінат і Дом друку — вядучыя нашы паліграфічныя прадпрыемствы, цяпер актыўна і эфектыўна працуюць над вырашэннем гэтага пытання, і школьнікі атрымаюць своечасова ўсе падручнікі, якія запланаваны да выдання сёлета. Больш за палову ўсяго кнігавыдання Беларусі складае навучальная і вучэбна-метадычная літаратура. Гэта па найменнях. Што датычыцца тыражоў, то гэта больш як 70 працэнтаў. У мінулым годзе агульным тыражом навучальных і вучэбна-метадычных выданняў убачыла свет больш за 15 мільёнаў экзэмпляраў. Гэта сведчыць аб тым, што беларусы — нацыя адукаваная, імкнецца да адукацыі. Настаўніцка-выкладчыцкі склад актыўна працуе над тым, каб пашырыць веды дзяцей не толькі па падручніках, але і даць ім метадычны дапаможнік, дадатковую літаратуру, каб можна было працаваць дома, каб выявіць зацікаўленасць дзяцей нават у прафесійным плане, — распавёў начальнік упраўлення.

Паводле яго слоў, сярод вучэбнай літаратуры шмат папулярных і запатрабаваных у школьнікаў, выкладчыкаў і іх бацькоў кніг. Ён асабліва адзначыў серыю «Школьная бібліятэка», у выданні якой удзельнічала Міністэрства адукацыі. У гэтай серыі мастацкія творы, якія вывучаюць у рамках школьнай праграмы і на пазакласным чытанні, — як дадатковы матэрыял.

— Шмат мастацкай літаратуры ў зборніках, сёлета яны прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі. У нас ёсць творы на беларускай мове, што вельмі важна для падрастаючага пакалення, — адзначыў Уладзімір Андрыевіч.



Асаблівая ўвага — выданню вучэбнай літаратуры для спецыяльных школ, у тым ліку тых, у якіх вучацца асаблівыя дзеці. Гэта вялікая адказнасць, таму што прамаляваць такую кнігу — сапраўды складаная, карпатлівая праца. Але мы выканаем задачы, якія стаяць перад намі, і ўсе падручнікі паступяць у навучальныя ўстановы своечасова, — запэўніла галоўны рэдактар і спынілася на некаторых асноўных цікавых навінках выдавецтва.

У прыватнасці, на пілотным праекце настольнай адукацыйнай гульні-віктарыны. Яна мае ўсё, каб цікава гуляць і адначасова развівацца і пазнаваць нешта новае: гульнявое поле, фішкі і блок абсалютна розных пытанняў па гісторыі, эканоміцы, геаграфіі, культуры і славутасцях. На думку Наталлі Цвірко, гульня будзе вельмі запатрабавана ў нашых установах адукацыі.

Працягваючы расказ аб навінках, галоўны рэдактар выдавецтва прааналізавала кнігу «Нацыянальны набытак Рэспублікі Беларусь»:

— Гэта навукова-папулярнае выданне аб гісторыі і культуры. У ім прадэманстраваны нашыя найлепшыя архітэктурныя помнікі, палаца-паркавыя комплексы, прадпрыемствы прамысловасці. Усё тое, што мы павінны максімальна паказваць нашым дзецям, бо шлях, які прайшла Беларусь за такі кароткі час сваёй незалежнасці, вельмі дастойны, і мы павінны і можам ганарыцца тым, што ў нас ёсць.

Асаблівая ўвага сёлета была ўдзелена тэме Вялікай Айчыннай вайны і вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Асаблівая ўвага сёлета была ўдзелена тэме Вялікай Айчыннай вайны і вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Так, да пачатку навучальнага года папоўніцца серыя кніг «Права на памяць», выйшла кніга «Жывы боль вайны» Ларысы Кучаравай, а таксама кніга «Аб тых, хто Сонца ў бітве абараніў: грузінскія воіны ў бітвах за Беларусь».**

## ДЛЯ АСАБЛІВЫХ ДЗЯЦЕЙ

Акцэнт на вучэбную літаратуру сёлета зрабіла выдавецтва «Адукацыя і выхаванне». Дзецям да пачатку новага навучальнага года яно яшчэ і сюрпрыз падрыхтавала — настольную гульню пра Беларусь. **Галоўны рэдактар выдавецтва Наталля ЦВІРКО** расказвае:

— Літаратуру рыхтавалі для ўсіх тыпаў устаноў адукацыі: ад агульнай сярэдняй да вышэйшай.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Так, да пачатку навучальнага года папоўніцца серыя кніг «Права на памяць», выйшла кніга «Жывы боль вайны» Ларысы Кучаравай, а таксама кніга «Аб тых, хто Сонца ў бітве абараніў: грузінскія воіны ў бітвах за Беларусь».

## ГАЛОЎНАЯ КНІГА Ў КРАІНЕ

Як згадвалася вышэй, у новы навучальны год школьнікі трох розных узроставых катэгорый атрымаюць новых памагатых. Падручнікі апрабаваны ў 14 мінскіх школах і запушчаны ў масавы тыраж.



Але, як заўважыла **начальнік метадычнага цэнтра Акадэміі адукацыі Людміла РАМАНОЎСКАЯ**, гэта далёка не ўсе навіны, якія датычацца падручнікаў і дапаможнікаў:

— Для чацвёртага класа выпусцілі падручнікі па беларускай, рускай, англійскай, нямецкай і кітайскай мовах, а таксама «Літаратурнае чытанне». Навучэнцы пятых класаў будуць вучыцца па перавыдадзеным падручніку беларускай мовы, а для шасцікласнікаў абнавілі навучальныя дапаможнікі па інфарматыцы і іспанскай мове. Новым тыражом выпусцілі падручнік па Сусветнай гісторыі і мастацтве для сёмага класа. Для навучэнцаў восьмага перавыдалі адразу шэсць падручнікаў: па хіміі, алгебры, геаметрыі, беларускай літаратуры, фізіцы, рускай мове.

— Мы паставілі сябе на месца вучня, напрыклад, восьмага класа. У яго партфелі — «Хімія», «Фізіка», «Геаграфія», «Алгебра», «Геаметрыя» і гэтак далей. Навігацыйны апарат, рубрыкі, знакі, сімвалы ў кожным падручніку розныя, і не заўсёды гэта дапамагае яму ў адукацыйным працэсе. Таму прынялі рашэнне, што навігацыйны апарат лепш аптымізаваць, а рубрыкі, якія маюць падобны сэнс і прызначэнне ў розных навучальных дапаможніках, зрабіць скразнымі, гэта значыць аднолькава пазначыць, — растлумачыла мэтазгоднасць змяненняў у падручніках Людміла Раманоўская.

Распавяла яна і аб навацыях. Напрыклад, аб тым, што цяпер кожны навучальны дапаможнік на другой і трэцяй ступенях агульнай сярэдняй адукацыі — з пятага да адзінаццатага класа — змяшчае ўступны артыкул «Як працаваць з навучальным дапаможнікам». А тэрміны і паняцці, якія школьнікі абавязаны ведаць на памяць, надрукаваны паўтлустым курсівам. Гэта значна палягчае працу не толькі самога школьніка, але і бацькоў, якія дапамагаюць дзецям з дамашнімі заданнямі. Таксама пры перавыданні навучальных дапаможнікаў вырашалася задача па нарошчванні выхаваўчага патэнцыялу падручніка.

— Мы разумеем, што падручнік — гэта галоўная кніга ў краіне, — адзначыла Людміла Раманоўская. — І ад таго, які падручнік ці дапаможнік у руках дзіцяці, у пэўнай ступені залежыць наша будучыня і тое, каго мы выгадуем з нашых сённяшніх школьнікаў.

Па словах кіраўніка цэнтра, былі прыкладзены ўсе намаганні, каб структурныя кампаненты навучальных дапаможнікаў рэалізоўвалі менавіта такі выхаваўчы патэнцыял. Яму павінны падпарадкоўвацца і асноўны тэкст, і дадатковы, і ілюстрацыі. Яна зазначыла, што ў падручніках і дапаможніках новага навучальнага года пашырана колькасць заданняў, тэкстаў, практыкаванняў, якія расказваюць нашым дзецям аб дасягненнях Беларусі ў розных сферах грамадскага жыцця: медыцыне, спорце, прамысловасці, сельскай гаспадарцы. Што важна — істотна адкарэкціраваны ілюстрацыйны матэрыял. Ён насычаюцца традыцыйнымі арнаментальнымі матывамі ў афармленні, а сюжэтныя карцінкі дэманструюць тавары беларускай вытворчасці.

**«Для чацвёртага класа выпусцілі падручнікі па беларускай, рускай, англійскай, нямецкай і кітайскай мовах, а таксама «Літаратурнае чытанне». Навучэнцы пятых класаў будуць вучыцца па перавыдадзеным падручніку беларускай мовы, а для шасцікласнікаў абнавілі навучальныя дапаможнікі па інфарматыцы і іспанскай мове. Новым тыражом выпусцілі падручнік па Сусветнай гісторыі і мастацтве для сёмага класа. Для навучэнцаў восьмага перавыдалі адразу шэсць падручнікаў: па хіміі, алгебры, геаметрыі, беларускай літаратуры, фізіцы, рускай мове».**

## АД АЛОЎКА ДА КАРТЫ СВЕТУ

Крайняй, акрамя, зразумела, школьных бібліятэк, інстанцыяй на шляху падручніка ці дапаможніка ад складальнікаў да спажыўцоў, у нашым выпадку — школьнікаў ці студэнтаў — з'яўляюцца арганізацыі гандлю. Дарэчы, яны сёння таксама ў напружаным стане: пік пакупніцкай актыўнасці школьнага асартыменту прыходзіцца менавіта на апошнюю дэкаду жніўня і першую — верасня.

Паводле слоў **генеральнага дырэктара ААТ «Белкніга» Уладзіміра МАТУСЕВІЧА**, ніякі ажыятажны попыт для найбуйнейшага кнігагандлёвага прадпрыемства Беларусі не страшны.

— Пачатак новага навучальнага года — важны перыяд для ўсіх нас, — кажа кіраўнік прадпрыемства. — Мы да яго рыхтуемся, ідзе актыўнае насычэнне крам (а іх у нашай сетцы 94) усім неабходным асартыментам тавараў. Вядома ж, гэта, у першую чаргу, літаратура — вучэбна-метадычная, дадатковая — для самастойных заняткаў, навуковая і спецыяльная, мастацкая і іншая. Акрамя таго, у пераліку неабходнага для школьнікаў — дзясяткі найменняў канцтавараў. Гэта дзённікі, сшыткі, альбомы для малявання, пэндзлі і простыя алоўкі, вымяральныя прылады, пластылін, фарбы і каляровыя алоўкі...

Асобна хацеў бы спыніцца на кнігах для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. Для іх асартымент не проста разнастайны — вельмі цікавы. У ім ёсць гульнявыя кнігі і настольныя гульні, кнігі для развіцця і энцыклапедыі.

Уладзімір Матусевіч падкрэсліў, што спецыялісты прадпрыемства рэгулярна маніторадзь і адсочваюць магчымы павышаны попыт на тую ці іншую вучэбна-метадычную літаратуру і назапашваюць яе, каб хапіла ўсім. Больш за тое, падручнікі і дапаможнікі можна набыць, не выходзячы з дому, скарыстаўшыся анлайн-каталогам.

## ТРАДЫЦЫЯМ НЕ ЗМЯНЯЕМ

Як і ва ўсе апошнія гады, да пачатку навучальнага года выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» выпусціла кнігу «Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку». Сёлетняе выданне — з аўдыягідам. Другое традыцыйнае выданне, навучальны дапаможнік «Я — грамадзянін Рэспублікі Беларусь», убачыць свет да канца 2024-га. Па словах галоўнага рэдактара выдавецтва, дапаможнік зведае некаторыя змены:

— Асноўная ідэя гэтага выдання — кожны малады беларус павінен быць дастойным грамадзянінам сваёй краіны. Яна заўсёды была, ёсць і застанецца. Але сама падача інфармацыі мяняецца. Мы адыходзім ад статыстыкі і графікі на карысць ілюстрацыйна-тэкставай інфармацыі. Гэтая кніга пасля прачытання павінна выклікаць эмацыянальны водгук.

На заканчэнне кароткай размовы задалі Уладзіміру Уладзіміравічу пытанне, якое заўсёды лунае ў паветры пры зносінах з тымі, хто мае дачыненне да кніг.

***— На ваш погляд, сучасныя тэхналогіі і гаджэты ўсё ж такі заменяць калі-небудзь кнігу?***

— Хутчэй, яны буду суіснаваць. Кніга — рэч неабходная і важная, асабліва для дзяцей. Яна дапамагае развіваць маторыку, асацыятыўнае і аналітычнае мысленне. Начытаны чалавек — як правіла, пісьменны чалавек. Гэта шанавалася заўсёды, якую б прафесію — фізіка або лірыка, ён бы сабе ні абраў. Бацькам варта памятаць пра гэта і прывучаць сваё дзіця да культуры чытання. І потым, пагадзіцеся, пах новай кнігі, свежай друкарскай фарбы ні з чым не параўнальны...

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД і з адкрытых крыніц.**

# РЫХТУЙ ДАРОГІ ЛЕТАМ...



## ЭКЗАМЕН НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Як расказаў **начальнік упраўлення вытворчасці работ і ўтрымання дарожнай сеткі РУП Аўтамабільных дарог «Мінскаўтадар-Цэнтр» Дзмітрый ДЗЕМІДОВІЧ,** падрыхтоўка да зімы пачынаецца з прыняцця інжынерных рашэнняў.

— У нас 12 філіялаў, якія абслугоўваюць дарогі, і на мінулым тыдні мы закончылі прымаць ад іх інжынерныя прапрацоўкі. Такім чынам, кожная адзінка тэхнікі замацавана за пэўным участкам дарогі, за кожнай адзінкай тэхнікі — персанал. Вызначаны аб'ёмы супрацьгалалёдных матэрыялаў і іншых элементаў, якія неабходна нарыхтаваць. Удакладнены з улікам мінулага года снегазаносныя ўчасткі і метады барацьбы з заносамі, — праінфармаваў Дзмітрый Дземідовіч.

Прадпрыемства «Мінскаўтадар-Цэнтр» абслугоўвае дарогі Мінскай вобласці, а гэта 3428 кіламетраў, у тым ліку першай катэгорыі — 857 км, другой — 275 км, трэцяй — 1022 км, чацвёртай — 1272 км.

У сёлетнім сезоне прадпрыемствам будзе нарыхтавана 73 тысячы тон тэхнічнай солі, 104 тысячы тон пясчана-салянай сумесі, для абазначэння дарог у зімні перыяд выраблена каля пяці тысяч сігнальных вех. Акрамя таго, будзе ўстаноўлена 1700 шчытоў, уздоўж 20,5 км будзе ўсталявана снегазатрымлівальная сетка. На дарогах Мінскай вобласці будзе працаваць 141 солеразмеркавальнік, 17 грэйдараў, 59 пагрузчыкаў, 122 трактары, 7 ротарных снегаачышчальнікаў. Сёлета на вылучаныя для абнаўлення тэхнікі сродкі было набыта дзевяць новых аўтамабіляў і тры пагрузчыкі. З сярэдзіны верасня пачнецца нарыхтоўка складаванай аргана-мінеральнай сумесі для ямачнага рамонту ў зімовы перыяд.

А пакуль на дарогах працягваецца асфальтаўкладка. За бягучы летні сезон у Мінскай вобласці запланавана адрамантаваць 313 км дарог, і на сёння гатовы ўжо 265 км, работы на астатніх 48 км будуць завершаны да канца верасня.

У сталіцы таксама вядуцца работы па рамонце вулічна-дарожнай сеткі. Яе плошча, дарэчы, складае каля 25 млн м кв., працягласць каля 1,5 тысячы км.

— Падрыхтоўка да наступнай зімы пачынаецца пасля завяршэння папярэдняй. У вясенне-летні перыяд праводзяцца работы ў межах бягучага рамонту і ліквідацыі ўсіх дэфектаў. Гэта ўстараненне калейнасці, ямачны рамонт, заладка трэшчын, ахоўная апрацоўка. Праводзяцца ў Мінску і работы з поўнай заменай асфальта-бетоннага пакрыцця, — расказаў **начальнік Упраўлення «Цэнтр» дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» Руслан ЯСЮЧЭНЯ,** дадаўшы, што кожны год праходзяць сезонныя асенне-вясеннія агляды вулічна-дарожнай сеткі, па выніках якіх спецыяльная праграма выстаўляе адзнакі. Пры стане «дрэнна» прымаецца рашэнне па ўключэнні гэтых вуліц у план работ па поўнай замене пакрыцця, і гэта штогадовы працэс.

Праводзяцца і работы па падрыхтоўцы тэхналагічнага транспарту і абсталявання да зімы. Гэта абслугоўванне і рамонт, якія будуць скончаны да сярэдзіны кастрычніка. Частка тэхнікі ўніверсальная і выкарыстоўваецца круглы год, у прыватнасці, солеразмеркавальная тэхніка ў летні перыяд працуе на рамонце дарог.

У найбліжэйшы час прадпрыемствы прыступяць да нарыхтоўкі супрацьгалалёдных матэрыялаў — пясчана-салянай сумесі і тэхнічнай солі, і да сярэдзіны кастрычніка будзе забяспечаны іх неабходны запас.

У склад ДВА «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама» ўваходзіць 14 арганізацый. Гэта рамаўтадары раёнаў, а таксама «Макрадар» (завод па выпуску асфальтабетонных сумесяў, які выпускае і супрацьгалалёдныя сумесі), «Гораўтамост» (прадпрыемства, якое абслугоўвае падземныя пераходы, масты, пуцеправоды), «Гаррамліўнясцёк» (абслугоўвае дажджавую каналізацыю).

## ЦІ ПАТРЭБНЫ РАМОНТ «БЕТОНКАМ»?

Як адзначыў Дзмітрый Дземідовіч, пераважная большасць дарог з цэментна-бетонным пакрыццём пабудаваны ў 1984-1985 гадах, і на стадыі праектавання закладваўся тэрмін службы 30 гадоў. З гэтай прычыны яшчэ 10 гадоў таму закладзены праектам тэрмін эксплуатацыі скончыўся. Але гэтыя дарогі дагэтуль у нармальным стане, падтрымліваюцца за кошт бягучага рамонту, і глабальных планаў па капітальным рамонце ці рэканструкцыі пакуль няма.

Пры гэтым сёлета вядзецца капітальны рамонт дарогі Р-65 Заслаўе — Дзяржынск — Возера.

— На выхадзе з Дзяржынска маецца ўчастак з цэментна-бетонным пакрыццём. Сёлета там праводзіцца капітальны рамонт. У плітах будзе знята напружанне, пакрыццё захаваецца, зверху будуць укладзены два слоі асфальтабетону. Пры будаўніцтве гэта дарога, а яна чацвёртай катэгорыі, была разлічана на нагрузку 8 тон, у той час як пераважная большасць дарог, якія будаваліся яшчэ пры Савецкім Саюзе, былі разлічаны пад нагрузку 11,5 тоны. Рэаліі такія, што гэта «бетонка» не вытрымлівае. Таму будзе ўмацавана пакрыццё зверху. У кастрычніку капітальны рамонт участка Р-65 плануем завяршыць.

## ЧАМУ ВЯСНОЙ ЗНІКАЕ РАЗМЕТКА?

Як патлумачыў Дзмітрый Дземідовіч, згодна з дзейнымі нарматыўнымі дакументамі, гарантыйны тэрмін на гарызантальную разметку, нанесеную з прымяненнем эмалі, складае паўгода. Пры гэтым інтэнсіўнасць руху не павінна перавышаць 10 тысяч аўтамабіляў за суткі.

— Амаль на ўсіх выездах з Мінску на нашых дарогах інтэнсіўнасць больш за 20 тысяч. А на кальцавой у сталіцы на адным з участкаў была зафіксавана інтэнсіўнасць 137 тысяч. Можна наносіць гарызантальную разметку і іншымі матэрыяламі. Гэта халодныя пластыкі (тады гарантыйны тэрмін складае да двух гадоў у залежнасці ад таўшчыні) і гарачыя пластыкі (гарантыйны тэрмін — да чатырох гадоў). Можна разглядаць два варыянты: абнаўляць разметку два разы на год, а для гэтага нам прыйдзецца павялічыць колькасць персаналу і тэхнікі, ці пераходзіць на іншыя матэрыялы. Пры гэтым кошт халоднага пластыку і работы па яго нанясенні у 2,5 раза вышэйшы, чым эмалі, гарачага пластыку — у 3,5-4 разы, — прывёў лічбы спецыяліст.

Разглядаліся і варыянты палепшыць саставы эмалі. Два беларускія вытворцы, брэсцкая кампанія «СТіМ» і Мінскі лакафарбавы завод, здольны забяспечыць дарожнікаў неабходнымі аб'ёмамі разметачнай эмалі. Аднак змяненне саставу эмалі пацягне падаражанне.

— Павялічыць тэрмін эксплуатацыі да года немагчыма, максімум да васьмі месяцаў, пры гэтым падаражанне — у разы. На ўзроўні Міністэрства транспарту прапрацоўваюцца розныя варыянты. Сёлета на ўчастку ў тым ліку і нашых дарог будуць нанесены эксперыментальныя эмалі ад розных вытворцаў з больш доўгім цыклам службы. Праводзіцца навуковае суправаджэнне, пасля гэтага будзе прынята рашэнне, ці ёсць сэнс выдзяляць на гэта дадатковыя бюджэтныя грошы, — адзначыў Дзмітрый Дземідовіч.

**«Падрыхтоўка да наступнай зімы пачынаецца пасля завяршэння папярэдняй. У вясенне-летні перыяд праводзяцца работы ў межах бягучага рамонту і ліквідацыі ўсіх дэфектаў. Гэта ўстараненне калейнасці, ямачны рамонт, заладка трэшчын, ахоўная апрацоўка. Праводзяцца ў Мінску і работы з поўнай заменай асфальта-бетоннага пакрыцця».**

**У сёлетнім сезоне прадпрыемствам будзе нарыхтавана 73 тысячы тон тэхнічнай солі, 104 тысячы тон пясчана-салянай сумесі, для абазначэння дарог у зімні перыяд выраблена каля пяці тысяч сігнальных вех. Акрамя таго, будзе ўстаноўлена 1700 шчытоў, уздоўж 20,5 км будзе ўсталявана снегазатрымлівальная сетка. На дарогах Мінскай вобласці будзе працаваць 141 солеразмеркавальнік, 17 грэйдараў, 59 пагрузчыкаў, 122 трактары, 7 ротарных снегаачышчальнікаў. Сёлета на вылучаныя для абнаўлення тэхнікі сродкі было набыта дзевяць новых аўтамабіляў і тры пагрузчыкі. З сярэдзіны верасня пачнецца нарыхтоўка складаванай аргана-мінеральнай сумесі для ямачнага рамонту ў зімовы перыяд.**

## СОЛЬ ЦІ КРОШКА?

У некаторых краінах дарожнае пакрыццё зімой апрацоўваюць не толькі тэхнічнай соллю, але і іншымі матэрыяламі. Пры гэтым важна, каб яны выраблялiся ў краіне, а не завозіліся.

— Можна дарогу апрацаваць сродкамі ў 10 разоў даражэйшымі, але ці гатовы падаткаплацельшчыкі аддаваць болей? Вопыт іншых краін паказвае, што лепшага за хларыд натрыю нічога няма. Напрыклад, у Маскве прымяняюць хлорысты кальцый. Яго цана ў Беларусі разам з лагістыкай у восем разоў даражэйшая, а матэрыял больш патрабавальны. Калі тэмпература будзе на два градусы ніжэйшая, чым спрагназавалі, ён пачынае працаваць, але потым усё, што ён растапіў, зноў замярзае. Калі вы не ўгадалі норму і тэмпература на градус-два ніжэйшая, вада хутка замерзне. З хлорыстым натрыем такога не адбываецца, — патлумачыў Дзмітрый Дземідовіч.

У скандынаўскіх краінах дарогі апрацоўваюць крошкай. Аднак і з ёй шмат нюансаў.

— У гэтых краінах скалы, адпаведна шмат каменнай пароды, і дарогі там апрацоўвалі крошкай, але сыходзяць ад гэтага. У гарадах крошка забіла ўсю лівневую каналізацыю, яна там літаральна зацэментавалася. Ёсць і іншы нюанс. Беларусы заўсёды хочуць бачыць дарогі чорнымі і чыстымі, без снегу, і ехаць 120 км/г. У скандынаваў па-іншаму. Па-першае, зімой уводзіцца абмежаванні да 80 км/г, па-другое, у іх адрозніваюцца патрабаванні да дарог у дзённы і начны час, у выходныя і будныя дні, таму яны і расходуюць менш рэагентаў.



Алена КРАВЕЦ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

22 ЖНІЎНЯ
2024 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15983)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Алена БЛАГАДЗІР:

# «ЧЫМ БОЛЬШ ПЕСЕНЬ — ТЫМ ЛЕПШ!»



Наша госця — падапечная Васіля Раінчыка. Будучую зорку маэстра вучыў быць упэўненай не толькі на сцэне, але і ў жыцці. «А жыццё — гэта экзамен, які трэба прайсці з годнасцю», — упэўнена артыстка. Пасля заканчэння ўніверсітэта дзяўчыне давождзілася сумяшчаць музычную кар'еру з выхаваннем маленькага сыночка. Сёння яна мае медаль за творчыя заслугі, з 2021 года ўваходзіць у склад Саюза музычных дзеячаў, з'яўляецца салісткай ваеннага аркестра і аўтарам уласных музычных твораў. Чым здзіўляе слухача маладая, таленавітая Elen (сцэнічны псеўданім Алены Благадзір), як любіць бавіць час у вёсцы і за якія заслугі ёй далі медаль — чытайце ў нашым інтэрв'ю.

***— Elen, калі лепш за ўсё пішуцца хіты?***

— Самыя лепшыя хіты атрымліваюцца, калі на душы дрэнна і хочацца ўсё выкласці на паперу (*смяецца*). Напісанае паказваю мужу, бо ён таксама мае дачыненне да музыкі. Калісьці ў яго быў рок-гурт. Кажа: «Вось гэта клас, а гэта — можаш нават не брацца». Пасля маме паказваю. Яна педагог з музычным ухілам. Лічу, правільна даць паслухаць спачатку прафесіяналу. Пасля — аматару. Таму што можна натварыць і ў аранжыроўцы, і ў тэксце такога... У маім выпадку фактар — «падабаецца / не падабаецца» — працуе.

***— Хто з родных яшчэ звязаны з музыкай?***

— У мяне бацька — выканальнік рамансаў, скончыў універсітэт культуры і мастацтваў па дырыжыраванні. Брат Віталь Блага — акардэаніст-віртуоз, з'яўляецца топавым вядучым. Сястра скончыла музычную школу. Дзве бабулі спявалі. Адну запрашалі ў хор салісткай. Ёй было б цікава ўбачыць, што ўнучка пайшла па музычнай сцяжыне.

***— А калі зразумелі, што музыка — для вас усё?***

— Заўсёды гэта ведала. Была ўпэўненасць яшчэ нават у школе. Займалася ў студыі Васіля Пятровіча Раінчыка. Цяпер перыядычна бачу маэстра на канцэртах, кажу: «Васіль Пятровіч, вялікі дзякуй Вам!». Яго прафесіяналізм і вера надалі ўпэўненасці, што ўсё атрымаецца. Бо калі маленькую дзяўчынку запрашаюць на сцэну з зоркамі, у яе каленкі трасуцца, даюць мікрафон і яна павінна спяваць не пад «плюс», а пад «мінус», паказаць вакальныя даныя — гэта страшна. Школа Раінчыка была маім стартам.

***— Напэўна, было цяжка прабіцца на эстраду? З чаго пачыналі?***

— Калі пайшла на свае хлябы — пісала песні, займалася арганізацыяй мерапрыемстваў, то бацька быў вядучым на вяселлях. Я з ім — як салдацік — на ўсе святы. І спявала, і вядучай была. Ва ўніверсітэце культуры вучылася на спецыяльнасці «Эстрадны вакал». Туды проста так не трапіш. Са ста чалавек прыкладна выбіралі чатырох. Такі быў шалёны конкурс. Памятаю, тады падумала: нічога сабе — прайшла!

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Час маладых

## Будаўніцтва з новымі магчымасцямі

У лістападзе гэтага года завершыцца першая чарга будаўніцтва Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі ў Брэсцкай крэпасці. Гэтай інфармацыяй падзяліўся старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр Пархомчык, паведамляе БелТА.



Першая чарга ўключае ў сябе рэканструкцыю казармы 125-га стралковага палка пад спальны корпус на 200 чалавек для пражывання навучэнцаў, а таксама добраўпарадкаванне навучальных памяшканняў і комплекс разнастайных спартыўных пляцовак на тэрыторыі.

Таксама Пётр Пархомчык дадаў, што ўжо рыхтуецца праектна-каштарысная дакументацыя для другой чаргі будаўніцтва патрыятычнага цэнтра:

— Не трэба расцягваць працу, варта, наадварот, паскарацца. Тым больш будоўля мае ўсебеларускі характар. Многія прадпрыемствы, калектывы жадаюць прыняць удзел у ёй. Таму папрасіў, каб другую чаргу мы дакладна спланавалі, дакладна паставілі тэрміны, паглядзелі пытанні фінансавання другога этапу і пачалі яго ў такім жа прыкладна тэмпе, з такім жа жаданнем. І ў пачатку 2025 года трэба спланаваць работу па завяршэнні, гэта значыць, па трэцім этапе.

Падчас другой чаргі будаўніцтва плануецца рэканструяваць 20 казематаў тэнальнага фронту пад стварэнне навучальнага корпуса, а таксама аднавіць гістарычны будынак XIX стагоддзя, дзе ў 20 класах змогуць займацца навучэнцы. Больш за тое, будуць праведзены работы па рэканструкцыі сталовай на 300 пасадачных месцаў і добраўпарадкаванні тэрыторыі. А на трэцім этапе ўжо плануюць рэканструяваць Заходні форт на Кобрынскім умацаванні для размяшчэння там навучальна-забаўляльнага цэнтра на 500 навучэнцаў. Усе будаўнічыя работы будуць ажыццяўляцца па меры паступлення фінансавання.

— Я бачу, што нават таго, што спланавалі, напэўна, будзе недастаткова. Думаю, жаданне моладзі трапіць сюды, прайсці падрыхтоўку будзе значна большым, чым магчымасці цэнтра. Амаль 250 хлопчыкаў і дзяўчынак змогуць тут праходзіць навучанне. Гэта кропля ў моры, — падзяліўся Пётр Пархомчык.

Па яго словах, трэба падумаць над тым, каб павялічыць магчымасці цэнтра, хаця сярод усяго іншага прадугледжваецца і палатачны лагер на 300—400 чалавек.

## На вяршыні «Алімпіі»

Рэспубліканскі спартыўна-масавы фестываль для працоўнай моладзі «Алімпія-2024» пад слоганам «30 гадоў якасці!» прайшоў 15—17 жніўня ў палатачным гарадку на беразе ракі Ісляч ва ўрочышчы Дубы.

Праграма была напоўнена конкурсамі і інтэрактывамі. Не абышлося і без наваўвядзенняў. Па словах сакратара ЦК БРСМ Веранікі Гудковай, сёлета колькасць адукацыйных пляцовак была павялічана да пяці.

— Нашы спікеры правялі гутаркі і трэнінгі з працоўнай моладдзю на самыя розныя тэмы. Гэта і патрыятычнае выхаванне маладых людзей, і наставніцтва, і традыцыйныя сямейныя каштоўнасці. Распавялі і пра дзяржпадтрымку, якая ёсць у нашай краіне для маладых сем'яў і маладых спецыялістаў. Акрамя таго, пагутарылі на тэму лідарства і папулярызацыі беларускіх брэндаў у медыяпрасторы, — падзялілася яна.

Па словах намесніка міністра адукацыі Кацярыны Пятруцкай, пляцоўкі фестывалю «Алімпія» — гэта тое, што аб'ядноўвае моладзь:




— Тут зараджаецца тое сяброўства і тыя кантакты, якія дазволяць вам рухацца далей, упэўнена ісці па жыцці і развівацца ў сваёй прафесіі. Сёння маладыя людзі — аснова будучыні і якасная развіцця нашай Радзімы, нашай Беларусі.

Для таго, каб стаць абсалютным чэмпіёнам, неабходна было атрымаць найменшую суму месцаў, занятых камандай у «заліковых» намінацыях, дзе патрабавалася паказаць не толькі добрую фізічную падрыхтоўку, але і праявіць сябе творча і інтэлектуальна. Таксама па-за конкурснай праграмай для ўдзельнікаў арганізавалі спаборніцтвы па міні-футболе і валейболе. Усяго ў фестывалі прынялі ўдзел 19 маладзёжных каманд пярвічных арганізацый і галіновых камітэтаў БРСМ працоўных калектываў з усёй краіны.

Па выніку ўсіх выпрабаванняў пераможцам стала каманда ААТ «ААБ Беларусбанк». З 2012 года яна пастаянны ўдзельнік фестывалю і ўжо трэці раз атрымлівае тытул абсалютнага чэмпіёна «Алімпіі». Другое месца дасталося Брэсцкай абласной арганізацыі БРСМ, а трэцяе — ААТ «Скідзельскі цукровы камбінат».

# «ЧЫМ БОЛЬШ ПЕСЕНЬ — ТЫМ ЛЕПШ!»

*(Заканчэнне.*
***Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

Пасля заканчэння універсітэта набіраўся першы склад Маладзёжнага тэатра эстрады. Працавала ў ім пэўны час. Дарэчы, ва універсітэце са мной вучыліся знакамітасці, напрыклад, Вольга Змуршчык, малодшай на курс была Вікторыя Алешка. Памятаю, як разам з Вікай хадзілі ў трэнажорку — яна заўсёды з песняй і спортам (*смяецца*). Песні ў яе шыкоўныя, нездарма ж заслужаная артыстка! Кампазіцыю «Сапраўднае золата» абажаю!

***— У вас прыгожае прозвішча ці гэта псеўданім?***

— Гэта не сцэнічны псеўданім, а маё дзявочае прозвішча (*смяецца*). Нас, Благадзіраў, не так шмат. Многія мяркуюць, што яно балгарскае, украінскае, хоць мы найчысцейшыя беларусы. Род па бацькавай лініі з Магілёва. Калісьці прапрадзядулю назвалі так таму, што займаўся дабрачыннасцю. Я падымала генеалагічнае дрэва. Жыў пры царкве. Быў вельмі паважаным у сваёй мясцовасці чалавекам. Паступова форма прозвішча змянялася — Благадар, Благадзэ, Благадзір (пасля не зусім правільна напісалі). Трэба сказаць, што працягваю жыццёвую місію продкаў — з'яўляюся творчым арганізатарам шматлікіх дабрачынных праектаў.

***— Elen, раскажыце пра сваю сям'ю.***

— Падчас вучобы ва універсітэце культуры і мастацтваў сустрэла мужа. Нарадзіла сыночка Рыгора. Памятаю: я на канцэрце, а родныя прыязджалі да мяне па малако для малога. Дзякуй, што побач былі матуля, свякроў, свёкар, нават аднакласнікі падтрымлівалі. Без падтрымкі нават не ведаю, як можна спраўляцца. Першы год, калі здарылася выходзіць у свет, не было часу ўсё разглядаць — прыбегла, спаць паклала, малака нарыхтавала — перадала, пабегла далей песні спяваць. З павагай адношуся да жанчын, якія нараджаюць шмат дзяцей: гэта такая цяжкая праца!

***— Вы з'яўляецеся салісткай ваенна-духавога аркестра вайсковай часці 3214...***

— Гэта асноўнае месца працы. Сёлета мяне ўзнагародзілі медалём ад часці. Працую на карысць унутраных войскаў: напісала дзве песні для іх — «Беларускі спецназ» і «Дзякуй за службу». Трэцяя — «Унутраныя войскі» — у распрацоўцы.

***— А яшчэ вы ўладальніца аднаго з самых рэдкіх жаночых галасоў — контральта...***

— Гэта нізкі голас з сакавітымі нотамі, прыгожымі, аксамітнымі, якія кранаюць душы. У хоры спявала другім альтом.

***— Па якіх кампазіцыях вас пазнаюць?***

— Песні, якія выконваю на галоўных мерапрыемствах краіны, розныя. На патрыятычную тэму ёсць цудоўная кампазіцыя з кліпам «Процветай, родная Беларусь!» Яе любяць і апошнім часам паўсюль просяць выканаць. Карыстаецца папулярнасцю песня, з якой некалі пачынала, — «Нереально красивая». Ну, а сінгл «Там» часта круцяць па радыё, а на канцэртах усе падпяваюць. Найбліжэйшым часам думаю выпусціць відэаверсію песні. Спяваю эстраду, поп. Аднак у мяне розныя кірункі: ёсць нават поп-рок — кампазіцыя «Лёд», на якую зняты прыгожы кліп. Чым больш песень рознай тэматыкі — тым лепш! У аркестры спяваю і эстрадныя, лёгкія кампазіцыі, і творы на ваенную тэматыку.

***— З якімі аўтарамі супрацоўнічаеце?***

— Многія дасылаюць мне дэмкі, практычна гатовыя. Шмат песень, дзе аўтар — і музыкі, і слоў — я сама. Чатыры гады працую з Юрыем Кісялём, кіраўніком Palyurproduction. Песні рэальна стрэлілі і гучаць на радыёстанцыях. Кампазіцыі на ваенную тэматыку, напрыклад, піша для мяне Таццяна Кажэўнікава.

***— Вы атрымліваеце юрыдычную адукацыю. Думаеце калі-небудзь змяніць дзейнасць?***

— У нашай справе вельмі важна разбірацца ў юрыдычных пытаннях. Вучуся ў Акадэміі кіравання на факультэце кіраўніцкіх кадраў па спецыяльнасці «Юрыспрудэнцыя». Цікава вывучаць аўтарскае права. Лічу, атрыманыя веды спатрэбяцца ў працэсе творчай дзейнасці. Сферы культуры кіраўнікі заўсёды патрэбны! Магу ім быць. Чаму б і не! (*усміхаецца*).

***— Як аднаўляецеся? Дзе чэрпаеце сілы?***

— За 20 кіламетраў ад Мінска ёсць вёска Азярычына. Там у нас гаспадарка. З мужам разводзім пародзістых курэй (*смяецца*). Яны нясуць блакітныя яйкі. Не кармлю іх аніякай хіміяй. На лецішчы люблю адпачываць. Аднаўляюся менавіта так! Займаюся спортам, бегам, хаджу ў трэнажорную залу. Як кажуць: рух — гэта жыццё. Трэба абавязкова займацца спортам. Ездзіць у вёску — перазагружацца пасля канцэртаў. А колькі ў нас цудоўных санаторыяў! Адпачываю ў «Прыазёрным». А «Пліса» чаго вартая — тое ж самае, што ў Турцыю паехаць! Вельмі любім з мужам раку Бярэзіну. Сёлета паспела пабываць у Грузіі і ў Шры-Ланцы. Хачу ў Кітай. Увогуле, люблю вандраваць. Абажаю Сардзінію, Стамбул. Запомнілася экскурсія на радзіму Напалеона Банапарта. Гэта было маё жаданне пасля прачытанай кнігі. А яшчэ ў мяне ёсць хобі: пішу карціны алеем — катоў і прыроду.

***— Назавіце вашыя галоўныя якасці, якія дапамагаюць па жыцці.***

— Па-першае, я адказны чалавек. Калі сказала — зрабіла. Кантралюю любы працэс. Гэтая мая якасць нумар адзін. Па-другое, у адносінах прытрымліваюся правіла шчырасці. Па-трэцяе, люблю сваю справу. Без гэтага не будзе водгуку ад гледача.

**Гутарыла Надзея ЗУЕВА.**
**Фота з архіва спявачкі.**



### Бліц-апытанне

***— Калі колер, то гэта...***
— Белы.
***— Калі пара года, то ...***
— Лета.
***— Калі кніга, то гэта...***
— Ліён Фейхтвангер, раман «Гоя, альбо Цяжкі шлях пазнання» (люблю чытаць пра вялікіх людзей).
***— Калі эпоха, то гэта...***
— Наша, сучасная. Яна мяне задавальняе.
***— Калі пачуццё, то гэта...***
— Любоў. Без гэтага пачуцця нічога не атрымаецца. Трэба любіць сваю справу, радзіму, людзей вакол.

*Узаемадзеянне*

# ПАСПЯВАЕМ У СМАЛЕНСКУ

Маштабны фестываль «Моладзь — за Саюзную дзяржаву» пройдзе ў Смаленскай вобласці з 11 да 15 верасня. Ён збярэ 300 удзельнікаў, а разам з гледачамі і гасцямі ўвогуле аб'яднае 15 тысяч чалавек. Праграма форуму абяцае быць насычанай і цікавай. Так, на працягу тыдня пройдуць урачыстае адкрыццё і закрыццё фестывалю, выязныя канцэрты ў гарады Смаленскага рэгіёна, тэматычныя праграмы для ўдзельнікаў фестывалю, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, студэнтамі ВНУ, вечары дружбы моладзі Беларусі і Расіі і шмат іншага. Адной з цэнтральных падзей стане Конкурс выканаўцаў маладзёжнай песні. Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» паназірала за адборачным турам і пазнаёмілася з тымі, хто будзе абараняць гонар нашай краіны на міжнародным спаборніцтве.




— Вось ужо 17 гадоў БРСМ з'яўляецца арганізатарам аднаго з найбуйнейшых на постсавецкай прасторы фестывалю творчасці «Моладзь — за Саюзную дзяржаву». У гэтым годзе ён напоўнены шэрагам сэнсаў. Перш за ўсё, гэта 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама 25-годдзе падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, — заявіў першы сакратар ЦК ГА БРСМ Аляксандр Лук'янаў.

Распавёў, што на форуме прадугледжаны шэраг актыўнасцяў, якія дазволяць маладым людзям акунуцца ў фестывальны драйв, паглядзець на Смаленшчыну:

— Вядома, яны будуць спаборнічаць у конкурсе, але галоўнае — пазнаёмяцца, будуць сябраваць.

З розных куткоў нашай краіны паступіла больш за 220 заявак, але толькі 19 найлепшых выканаўцаў узялі ўдзел у выніковым адборачным туры. Гэта салісты, аўтары-выканаўцы, дуэты ці ансамблі ва ўзросце ад 16 да 25 гадоў. Кожны ўдзельнік прадставіў дзве песні, дзе першая раскрывала тэму любові да Радзімы, а другая — сучасныя маладзёжныя тэндэнцыі. Кампазіцыі выконвалі на рускай ці беларускай мовах, а ў якасці выключэння дазвалялася выкананне адной з песень на нацыянальнай мове выканаўцы. Акрамя таго, усе выступленні праходзілі пад фанаграму «мінус адзін».

Парадак нумароў адборачнага тура быў вызначаны лёсаваннем, а ацэньвала выканаўцаў прафесійнае журы. Так, вядомая спявачка беларускай эстрады Ганна Благава, якая ўваходзіла ў склад камісіі, запэўніла, што журы звяртала ўвагу на шматлікія аспекты, пачынаючы з таго, як чалавек выходзіць на сцэну, узаемадзейнічае з гледачом, і заканчваючы яго майстэрствам, мастацтвам вакальнага выканання.

— Калі ты імкнешся да вяршынь, то павінен паказаць сябе на ўсе сто. Зразумела, што ўдзельнікі хвалююцца, але для гэтага і праводзяць конкурсы: яны гартуюць характар артыста, удасканальваюць яго прафесіяналізм, — адзначыла артыстка.

Самым першым на сцэну выйшаў дуэт з Мінскай вобласці з запальнай песняй «Хата бацькоў».

— Мы ўдзельнікі студыі рознажанравага вакалу Median Voice. Другая наша песня — «Што ты зрабіў для Радзімы?» — падзяліліся Вікторыя Астроўка з БДЭУ і Арцём Палкін з БДУКМ. — Рады, што прыехалі на адбор разам, падтрымліваем адно аднаго.

Аднак па выніках нарады журы пуцёўку ў Смаленск атрымаў толькі Арцём. Уразіла нас яшчэ і Міхаліна Хвясюк з Мікашэвічаў, якая таксама паспяхова прайшла ўсе выпрабаванні адборачнага тура. Першая песня, якую яна выканала, прабірала літаральна да мурашоў. Высветлілася, што кампазіцыю «Размова» спецыяльна для дзяўчыны напісаў вядомы кампазітар Валерый Шмат.

— З-за ўзросту не магла ўдзельнічаць у фестывалі раней, а цяпер нарэшце ўдалося сюды трапіць. Аб'ездзіла ўжо больш за 200 конкурсаў. Праўда, быў своеасаблівы прыпынак — некаторы час не выступала: крыху адвыкла ад усёй гэтай атмасферы. Але сёння была прыемна здзіўлена таму, як добра нас сустрэлі і як арганізавалі, — падзялілася Міхаліна.

Другой песняй, якую выканала дзяўчына, стала «Позна» Наталлі Падольскай. Выбрала яна яе таму, што непадзеленае каханне — адна з актуальных праблем моладзі.

Таксама ў лік абраных конкурсантаў увайшлі Ангеліна Самалётава, Яраслава Сокал, Андрэй Цуба з Мінска, Надзея Дзегцярова і Дар'я Чэслаўская з Магілёва, Вікторыя Касцюкова з Гродзенскай вобласці. Усіх іх цяпер чакаюць іх галоўныя выступленні, якія пройдуць ужо ў верасні і атрымаюць ацэнку новай публікі. Жадаем поспехаў і будзем сачыць за іх фестывальнай дарогай!

***Лізавета ГОЛАД,***
***фота аўтара.***

Пакаленне XXI

# ПРЫГАЖУНЯ Ў ФОРМЕ

## Пра свой шлях да мары, падтрыманне фігуры і сапраўдную ваенную сям'ю



Ваенна-патрыятычнаму выхаванню дзяцей і моладзі сёння ўдзяляецца вялікая ўвага. Так, у кожным рэгіёне нашай краіны дзейнічае мноства такіх спецыяльных клубаў, у якіх дзеці сумяшчаюць прыемнае з карысным. Маладыя людзі паглыблена вывучаюць гісторыю Беларусі, вучацца пастаяць за сябе і блізкіх, атрымліваюць даволі каштоўны вопыт, які, несумненна, спатрэбіцца ў далейшым жыцці. Пра тое, як скачкі на скакалцы ды іншыя фізічныя нагрузкі дапамагаюць падтрымліваць фігуру, як правільна абыходзіцца са зброяй, аказваць першую медыцынскую дапамогу і здабыць сапраўдных сяброў, карэспандэнту «Чырвонкі. Чырвонай змены» распавяла выхаванка ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь» вайсковай часці 3214, маладагвардзеец, пачынаючы журналіст і важатая ваенна-патрыятычнага лагера «Доблесць», вучаніца сярэдняй школы № 209 горада Мінска Наталля БУРКОЎСКАЯ.





***— Наталля, раскажыце, калі ласка, пра сябе і чым для вас з'яўляецца ваенна-патрыятычны клуб?***

— З самага дзяцінства мае блізкія расказвалі мне гісторыі аб цяжкім ваенным часе, гераізме нашых салдат, стойкасці і адвазе беларускага народа, нязгаснай веры ў Перамогу і сапраўдным подзвігу маіх продкаў. Шмат у чым гэта паўплывала на мяне і на мой лёс. Цяперашні этап жыцця непарыўна звязаны з ваенна-патрыятычным клубам «Рысь» вайсковай часці 3214. Гэты час з'яўляецца для мяне вельмі значным і адказным. Руплівасць, старанасць у вучэбнай дзейнасці і фізічныя трэніроўкі дазволілі набыць новыя практычныя ўменні і навыкі, палепшыць фізічную і псіхалагічную ўстойлівасць для будучай службы ва Унутраных войсках Рэспублікі Беларусь.

Я іду ўжо ў 11 клас, мару паступіць у Ваенную акадэмію Рэспублікі Беларусь на ідэолага. Стаць будучым афіцэрам і з гонарам несці гэтае званне, праслаўляць сваю краіну, быць прыкладам для моладзі і спрыяць фарміраванню ў яе пачуцця патрыятызму — галоўная мая мэта. Сёння працую важатай у ваенна-патрыятычным лагеры «Доблесць» у вайсковай часці 3214. Таксама пішу артыкулы і раблю фатаграфіі, адпраўляючы іх у тэлеграм-канал Маладой гвардыі.

Стаць ваеннаслужачым марыла з ранняга ўзросту, дзякуючы маёй сям'і, фільмам, кнігам. Наш клуб — цудоўнае месца. Ён напоўнены цёплай сяброўскай атмасферай. Тут я павялічваю і адпрацоўваю свае навыкі па зборцы і разборцы зброі, рукапашным бai, дысцыплінаванасці, тактычнай падрыхтоўцы і вучуся многім іншым рэчам, але больш за ўсё мне падабаюцца мае таварышы, якія, упэўнена, у цяжкую хвіліну будуць знаходзіцца побач, нягледзячы ні на што.

У нас нярэдка праходзяць розныя спаборніцтвы і мерапрыемствы, у якіх я актыўна ўдзельнічаю. Больш за ўсё мне запомніўся першы палявы выхад, калі мы жылі ў палатках. Падчас выхаду шмат перамагала і працавала з неверагоднымі людзьмі, разам з якімі мы спявалі песні каля вогнішча, практыкаваліся ў ваеннай тапаграфіі і арыентаванні па мясцовасці. І першая стральба з баявой зброі назаўжды застанецца ў маёй памяці.

Дэвіз, які ідзе са мной па жыцці заўсёды: «Ёсць жаданне — тысяча спосабаў, няма жадання — тысяча падстаў». Напэўна, гэта дапамагае рухацца далей з узнятай галавой, не заўважаючы ніякіх перашкод. Вялікую падтрымку знаходжу ў маіх любімых бацькоў: маці і тата заўсёды побач і не даюць апусціць рукі ні пры якіх абставінах. Без іх я не справілася б, і ў гэтым у мяне няма сумневаў.

***— Ці з ахвотай сённяшняя моладзь ідзе ў ваенна-патрыятычныя клубы? Чаму там навучаюць?***

— У такіх клубах дзеці займаюцца ваеннай падрыхтоўкай, удзельнічаюць у ваенізаваных эстафетах, вывучаюць асновы медыцынскай падрыхтоўкі, тактычнай падрыхтоўкі, а таксама кіраванне беспілотнымі лятальнымі апаратамі.

Сучасную моладзь часта называюць пакаленнем X, пакаленнем Z ці яшчэ як-небудзь, бо мы сапраўды разбіраемся ў тэхніцы, IT і іншых кірунках. Пасля выпуску з ваенна-патрыятычных клубаў ёсць і пэўныя льготы пры паступленні ў ваенныя ВНУ краіны. Дарэчы, сёння дзяўчаты таксама актыўна імкнуцца паступіць у Ваенную акадэмію, дзе будуць вывучаюць ідэалогію, псіхалогію. Таму для дзяцей ваенна-патрыятычныя клубы — гэта велізарны плюс. Тая ж медыцынская падрыхтоўка можа спатрэбіцца ў любы момант. Вельмі важна, каб чалавек пры неабходнасці мог правільна аказаць першую медыцынскую дапамогу. Таксама кожны выхаванец можа пахваліцца тым, што ўмее страляць з сапраўднага аўтамата Калашнікава.

Дарэчы, на базе клубаў нярэдка праводзяцца спаборніцтвы па стральбе, у якіх удзельнічаюць выхаванцы Мінскага гарнізона. У святы, 23 лютага і 8 Сакавіка, на такіх спаборніцтвах я выбіла па 97 балаў са 100. Было пяць пробных стрэлаў і дзесяць адзіночных выніковых з дыстанцыі ў 50 метраў. Вядома ж, стральба заўсёды пад пільным наглядам ваеннаслужачых-спецыялістаў, каб усё было бяспечна.

***— Звязаць свой лёс з ваеннай службай — адказны, але складаны выбар, асабліва для прадстаўніцы прыгожага полу. Як абралі менавіта такі кірунак?***

— Было вельмі шмат роздумаў: куды ж пайсці, кім хачу стаць у будучыні? А любоў да службы ў нас перадаецца з даўніх часоў, з пакалення ў пакаленне. Тата, дзядуля, прабабуля і прадзядуля — усе ў розныя часы звязвалі сваё жыццё з ваеннай службай. І нават мой старэйшы брат не супраць служыць. Пасля заканчэння каледжа ён абавязкова папоўніць шэрагі Унутраных войскаў Беларусі.

Паступіць у Ваенную акадэмію нялёгка. Дзяўчыне, напрыклад, неабходна набраць каля 350 балаў. Для хлопцаў прахадны бал значна меншы, розніца адчувальная. Цяжка, але мы будзем ісці да канца! Вядома, не ўсім дзяўчатам гэта патрэбна, аднак пры гэтым апошнім часам многія прадстаўніцы прыгожага полу выказваюць жаданне звязаць сваё жыццё з Узброенымі Сіламі. Дзяўчаты нароўні з хлопцамі пры паступленні здаюць фізічныя нарматывы. Вядома, яны трохі прасцейшыя, чым у мужчын, усё ж такі паміж намі ёсць невялікая розніца. Пры паступленні буду здаваць гісторыю Беларусі, матэматыку і рускую/беларускую мову на выбар. Вельмі перажываю і хвалююся, але ведаю, што сям'я і таварышы з клуба мяне абавязкова падтрымаюць.

***— Нам вядома, што вы займалі першыя месцы ў спаборніцтвах па скачках са скакалкай. Раскажыце, ці дапамагае ваша актыўная дзейнасць у клубе падтрымліваць фігуру?***

— Заняткі фізічнай нагрузкай, рукапашным боем і скачкамі са скакалкай вельмі дапамагаюць сачыць за фігурай. У вайсковых часцях, як правіла, дзяўчаты маюць магчымасць займацца спецыяльным фітнесам. Гэта дазваляе нам падтрымліваць сваю фігуру ў добрай форме, заставацца стройнымі і прыгожымі. Фітнес, вядома, толькі для дзяўчат. Для мужчын у нас рукапашныя баі. Але калі раптам хлопец захоча займацца фітнесам разам з дзяўчатамі і скакаць на скакалцы, не думаю, што хтосьці будзе супраць (*смяецца*).

У цэлым, спаборніцтвы па фізічнай нагрузцы з'яўляюцца неад'емнай часткай дзейнасці ваенна-патрыятычных клубаў. Дарэчы, у іх удзельнічаем не толькі мы, але і госці з Расіі. За адну хвіліну на скакалцы я наскакала больш за 160 разоў! Займаюся таксама і дома, дзе ёсць і скакалкі, і розныя трэнажоры. Яшчэ ў мяне ёсць выхадны дзень, калі займаюся вышэйшай матэматыкай. Гэта вельмі цяжка, але неабходна пры паступленні. Даводзіцца вывучаць яе нават на канікулах. Пакуль займаюся сама, з верасня пачну хадзіць да рэпетытараў.

Акрамя скачкоў са скакалкай, качаем прэс, займаемся рукапашным боем. Гэта вельмі важнае ўменне, паколькі кожны чалавек павінен умець пастаяць за сябе. Некалькі разоў нават даводзілася заступацца за бліжніх. Навыкі рукапашнага бою часам правяраю на сваіх таварышах, а яшчэ часцей — на браце (*смяецца*). Праз год пасля таго як я асвоіла асновы рукапашнага бою, ён, мякка кажучы, трохі пацярпеў.

Яшчэ ў нас праводзяцца ваенна-палявыя зборы. На працягу дзевяці дзён удзельнічаем у розных спаборніцтвах і майстар-класах. Вывучаем там асновы фатаграфіі, увядзенне ў журналістыку, кіраванне беспілотнымі лятальнымі апаратамі, а таксама стральбу з пнеўматычнай зброі і асновы рукапашнага бою. У рамках насычанай праграмы ўдзельнікі збораў выязджалі ў Брэсцкую крэпасць, наведвалі іншыя мемарыяльныя комплексы. Мне вельмі спадабалася, калі мы наведалі Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Дзякуючы яе дырэктару Вадзіму Гігіну мы змаглі ўбачыць салют на самым высокім паверсе гэтага знакавага будынка.

***— Зусім нядаўна вы сталі ўдзельнікам міжнароднага праекта «Цягнік Памяці». Што цікавага ўбачылі падчас падарожжа?***

— Сёлета міжнародны праект «Цягнік Памяці» аб'яднаў патрыётаў з васьмі краін. Велізарную ролю ў станаўленні праекта адыгралі Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава, першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў, старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Валянціна Мацвіенка. Удзельнікі змаглі ўбачыць 14 гарадоў як у Беларусі, так і ў Расіі. Масква, Санкт-Пецярбург, парад у Мінску, Хатынь — некаторыя з прыпынкаў на нашым маршруце... Замежным гасцям вельмі спадабалася на рэканструкцыі ў Брэсцкай крэпасці. У такія моманты адчуваеш гонар за сваю краіну, калі многія госці параўноўвалі свае краіны з Беларуссю, і ўсе як адзін казалі, што хочуць да нас вярнуцца.

Асабліва запомнілася наведванне мемарыяльнага комплексу «Хатынь», дзе нам расказвалі пра подзвігі салдат і дзяцей. Мяне вельмі расчулілі ўсе гэтыя месцы, на кожным мемарыяльным комплексе немагчыма было стрымаць слёзы. Табе балюча за тых дзяцей, якія загінулі ў гэтай страшнай вайне. Наведваючы такія помнікі, пакідаеш там часцінку сябе як даніну памяці і павагі.

***— Каго больш у вашым асяроддзі — хлопцаў або дзяўчат? І ці не перашкаджае актыўная дзейнасць у клубе вучобе і асабістаму жыццю?***

— У маім асяроддзі ўсё ж такі больш дзяўчат. Колькі б ні казалі, што служба і ваенная справа больш падыходзіць для хлопцаў, у ваенна-патрыятычных клубах колькасць хлопцаў і дзяўчат аднолькавая. Актыўная дзейнасць у ваенна-патрыятычным клубе не перашкаджае вучобе і асабістаму жыццю. Гэта нават, наадварот, падштурхоўвае цябе на ўдасканаленне і далейшае развіццё. Дзякуючы гэтаму ў мяне вырас сярэдні бал, палепшылася фізічная падрыхтоўка. Таксама я атрымала цудоўны вопыт і цвёрдае жаданне рухацца толькі наперад. Для мяне вельмі важна, што родныя і блізкія падтрымліваюць мяне ва ўсіх пачынаннях. Ды і дзяржава робіць многае для дзяцей і моладзі, і гэта вельмі прыемна!

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота з архіва Наталлі БУРКОЎСКАЙ.**

# ЯРКА ПРА ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦЬ КОЖНАГА

«Яркія» — гэта слова асацыюецца з летам, святам, шчасцем і... з аднайменным кавер-гуртом, які сваімі выступленнямі дорыць усё гэта гледачам. Мы сустрэліся з удзельнікамі калектыву і даведаліся, з чаго пачынаўся іх творчы шлях, якія каверы з'яўляюцца любімымі ў публікі і як музыка дапамагла знайсці каханне.

— З большасцю ўдзельнікаў, якія сёння ў калектыве, мы знаёмыя з 2020 года. На той момант мы працавалі ў кавер-групе «Бязмежжа». Але неўзабаве вырашылі падкрэсліць нашу індывідуальнасць і сталі кавер-гуртом «Яркія», — распавядае Юліяна Грышановіч. — Чаму такая назва? Тут усё проста, бо менавіта гэтым словам можна ахарактарызаваць кожнага з нашай групы. Усяго ў склад уваходзіць шэсць музыкаў (адзін вакаліст і пяць інструменталістаў): барабаншчык, бас-гітарыст, электрагітарыст, трамбаніст і саксафаніст. Усе мы — прафесійныя музыканты з вышэйшай адукацыяй — скончылі ўніверсітэт альбо кансерваторыю.

— Менавіта назва «Яркія» цалкам падкрэслівае фармат і настрой нашай працы на сцэне, а таксама індывідуальнасць кожнага з нас. І яна лёгка запамінаецца і пакідае пазітыўныя эмоцыі, пра што заўсёды сведчыць зваротная сувязь ад заказчыкаў і арганізатараў, — дадае Міхаіл Парфяновіч.

Першае выступленне, якое адбылося ў клубе ў Смаргоні, гурт помніць і сёння. Тады яны хваляваліся і не ведалі, як прыме іх публіка.

— Акцэнт зрабілі на інтэрактыўную праграму і поўнае ўцягванне гледачоў у працэс выступлення з душэўным і фізічным кантактам. Вядома, цяпер у нас практычна няма невырашальных сітуацый, а вось падчас першага выступу пад маніторамі знаходзіліся лісты фармату А4 з пазнакамі тэкстаў песень і падводкамі паміж імі. Але, нягледзячы на нашы перажыванні і хваляванні, людзі ўключыліся, і заказчык застаўся задаволены, — згадвае Уладзімір Кавалеўскі.

— Кожны наш глядач, слухач важны і блізкі нам. На выступленнях збіраюцца людзі самага рознага ўзросту, і нам удаецца разварушыць нават самых уседлівых. Пад нашы песні танчаць дзеці, моладзь, і нават людзі сталага ўзросту не застаюцца абыякавымі. А ў гэтым і ёсць галоўны кайф артыста — бачыць аддачу сваёй аўдыторыі, — далучаецца да размовы Міхаіл Парфяновіч.

Як і ў любым калектыве, у «Яркіх» ёсць лідар, але разам з тым за кожным замацаваны пэўныя абавязкі, адзначае Іван Боеў: «Напрыклад, адзін займаецца менеджарскімі пытаннямі, іншы адказвае за вядзенне інстаграма, ёсць яшчэ адказны за тэхнічную частку». А вось рэпетыцыі залежаць ад сезона выступленняў. Як распавёў Ігар Дзіўкоў, «у летні і зімовы перыяд колькасць работ не дазваляе рэпеціраваць часта. Але гэтага і не патрабуецца, бо ў міжсезонне мы збіраемся па тры разы на тыдзень, каб падрыхтаваць паўнавартасную музычную і інтэрактыўную праграмы».

**— А як падбіраеце рэпертуар для сваіх выступленняў?**



— Песня павінна быць на слыху і пэўным хітом, каб захапіць публіку. Ну, і, вядома, пры выбары ўлічваем і ўзроставы дыяпазон гледачоў, заяўлены заказчыкам. Пэўнымі любімчыкамі публікі з'яўляюцца трэкі «Белыя ружы» і «Сёмы пялёстак». А што да нашых фаварытаў, то гэта трэкі гурта «Брава», Рыкі Марціна, Нірваны. Увогуле, нам падабаецца ўсе песні з нашага рэпертуару, — кажа Міхаіл Парфяновіч.

Што да стылю касцюмаў і вобразаў, то тут сама назва калектыву дае ім поўную прастору для творчасці. Як распавёў Герман Біткоў, усе касцюмы падбіраюць яны самастойна:

— У кожнага з нас ёсць свая ідэя, і мы ўлічваем гэта пры выбары вобразаў. На дадзены момант маем два вобразы: адзін з іх вулічны, маладзёжны, у прамым сэнсе яркі, а другі вобраз спалучае ў сабе стрыманасць і стыль, набліжаны да класікі. Але і тут нам падабаецца вылучацца. Увогуле, прыходзьце на нашы выступленні, і самі ўсё ўбачыце!

Што да планаў змяніць фармат кавер-гурта і перайсці да песень уласнага складання, то гэта таксама ёсць у планах «Яркіх». Бо, як адзначае Юліяна Грышановіч, як кавер-гурт яны ўжо дасягнулі пэўнай пазнавальнасці, навучыліся працаваць з публікай і цяпер самы час заняцца прасоўваннем уласнага музычнага матэрыялу калектыву: «Хочацца дастукацца праз музыку да сэрцаў кожнага нашага слухача, таму мы не спяшаемся, а якасна і прадуктыўна працуем над гэтым пытаннем» .

**— Ці часта гастралюеце і якія цікавыя выпадкі здараюцца ў такіх паездках?**

— Так, гастралюем мы даволі часта, у тым ліку і за межамі нашай краіны. Здараецца рознае, але ў большасці штосьці пазітыўнае. З прыемнага — дораць падарункі, а таксама трое з нашага кавер-бэнду знайшлі свае другія палавінкі дзякуючы выступленням, — дзеліцца Уладзімір Кавалеўскі.

**— Ці ёсць у вас прафесійная мара?**

— Было б выдатна стаяць на адной сцэне з заслужанымі артыстамі нашай краіны, гэта быў бы цікавы і карысны досвед для нас. Калі казаць больш шырока, то, як і любому творчаму калектыву, нам важныя прызнанне і любоў публікі. Таму плануем пашыраць маштаб мерапрыемстваў, хочацца пакінуць яскравы след у жыцці кожнага нашага слухача. Ды і ў цэлым, выступаць для нашай публікі — вялізная каштоўнасць для нас, таму сочым за тымі, хто скарае вышыні беларускіх сцэн, і імкнёмся да гэтага таксама.

**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота з архіва кавер-гурта «Яркія».**

*Карысна ведаць*

# «Зялёныя» падарожжы па Беларусі

## Як і дзе адпачыць без шкоды для экалогіі?

У апошнія гады экалагічны турызм стаў альтэрнатывай для тых, хто хоча не проста адпачыць на прыродзе, а зрабіць гэта, не нашкодзіўшы ёй. Да таго ж экатурызм — не самае дарагое, а часам і бясплатнае баўленне часу. У Беларусі існуе шмат варыянтаў такога адпачынку.

Напрыклад, экасцежкі. Адна з такіх знаходзіцца ўсяго за 48 кіламетраў ад Мінска і носіць назву «Святыя крыніцы». Гэтая тэрыторыя прызнана гідралагічным прыродным помнікам рэспубліканскага значэння, таму яе наведвальнікам неабходна выконваць простыя, але надта важныя правілы: не паліць вогнішчы, не смеціць, не ўстанаўліваць палаткі і не заязджаць туды на аўтамабілі. Экасцежка вядзе да крыніц, схаваных прыродай ад чалавека. Яны б'юць з самага верху гары і знакамітыя не толькі сваёй прыгажосцю, але і цікавай гісторыяй. Кажуць, на гэтым месцы стаяла царква, якая пайшла пад зямлю. З тых часоў тут і ўзніклі крыніцы, якія мясцовыя жыхары называюць «святымі».

Хто шукае больш маштабных прыгод, той іх знойдзе. У нашай краіне ёсць вялікая колькасць нацыянальных паркаў і запаведнікаў, якія адкрытыя для турыстаў. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры», які займае плошчу каля 70 тысяч гектараў. Усе азёры на яго тэрыторыі адносяцца да басейна Заходняй Дзвіны. У парку распрацавана некалькі пешаходных, водных і веласіпедных маршрутаў. Самы экзатычны — лодкавы тур «Бабровае сафары». Яго наведвальнікі маюць унікальную магчымасць убачыць гэтых дзіўных жывёл у іх натуральным асяроддзі.

Жадаеце акунуцца ў першародную прыроду і пазнаёміцца з непаўторнай флорай і фаўнай? Бярэзінскі біясферны запаведнік — унікальнае месца не толькі для Беларусі, але і для ўсёй Еўропы. Ён быў створаны для аховы і развядзення рэдкіх відаў жывёл, занесеных у Чырвоную кнігу. І мае плошчу 85,2 гектара. Сярод магчымых актыўнасцяў можна вылучыць адна- або двухдзённы конны маршрут «Лясныя таямніцы» ў суправаджэнні мясцовых гідаў. Ён пралягае праз маленькія вёсачкі і масіўныя лясы ўздоўж Сергуцкага канала. Акрамя таго, у Бярэзінскім запаведніку можна паўдзельнічаць у двухдзённым туры «Экатурызм на калёсах». Там вас чакаюць звілістыя сцежкі і начлег у турыстычным вагончыку ў сэрцы лесу — адным словам, неверагоднае задавальненне ад падарожжа.

